Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 71 (28687)

13 КРАСАВІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА



**Як выбраць якаснае насенне**
СТАР. 4



**Прывесці могілкі ў парадак**
МС



**Жанчына ў чырвоным...**
МС

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Васіль ЖАРКО, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Галоўная стратэгічная мэта такіх праектаў, як «100 ідэй для СНД», супадае з адной з задач дзяржавы — актывізацыяй інавацыйнай дзейнасці моладзі, раскрыццём яе інтэлектуальнага патэнцыялу і энтузіязму, стварэннем умоў для імкнення маладых людзей да ўвасаблення самых смелых ідэй. У сувязі з гэтым падобныя конкурсы і выставы — стартавая пляцоўка для раскрыцця такога патэнцыялу і энтузіязму, магчымасць заявіць пра сябе і свае ідэі на самую шырокую аўдыторыю і быць пачутым. Усе ўдзельнікі праекта для рэалізацыі сваіх ідэй выбралі такія сферы, як інжынерыя, медыцына, хімія, біялогія, экалогія, рабататэхніка, сацыяльная сфера. Гэта менавіта тыя вобласці, якія вызначаюць тэхналагічны прагрэс, эканоміку будучыні і накіраваны на забеспячэнне высокай якасці жыцця».*

ISSN 1990 - 763X

# «САКАВІТАЯ» ДЗЯЛЯНКА



У Валяр'янаўскім лясніцтве Уздзенскага лясгаса сёлета пад нарыхтоўку бярозавіку адведзены чатыры гектары лесу, на якіх падсочаны болей за дзвесце бяроз. Адказныя за нарыхтоўку — жыхары вёскі Хатляны Аляксандр ТРЫГУБОВІЧ і Валерый СЕЛІВОНЧЫК *(на першым плане)*. Яны не толькі аднавяскоўцы, але і сябры. Спорна і зладжана ідзе ў іх праца. За гэты сезон мужчыны павінны нарыхтаваць 36 тон соку.

На «сакавітую» дзялянку свайго лясніцтва часта наведваецца малады ляснічы — Іван ЛОШЧ, каб кантраляваць ход нарыхтоўкі, водпуск і продаж соку насельніцтву.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Разумныя грошы

# КІРУЕМ ЗБЕРАЖЭННЯМІ

## Сярэдняя стаўка па дэпазітах абароніць ад інфляцыі?

**Фінансісты любой краіны свету ўпэўнены, што грошы павінны працаваць нават тады (менавіта тады), калі поспехі ў эканоміцы не такія відавочныя... Зберажэннямі трэба проста правільна кіраваць. Як гэта рабіць — тут кожны выбірае свой алгарытм. Варыянтаў мноства, але яны залежаць ад сумы вашых накапленняў. Самы першы варыянт, які прыходзіць у галаву большасці і даступны ўсім, — адкрыць дэпазіт. Але не ўсё так проста, бо тэндэнцыі мяняюцца. Давайце разбяромся, якія бываюць банкаўскія ўклады і колькі можна на гэтым зарабіць.**

### Без эмоцый

Стабільная нацыянальная валюта — гэта тое, чаго мы чакалі, аднак... Днямі мне патэлефанавалі адразу трое сяброў, якія пыталіся наконт выкарыстання свабодных зберажэнняў. Ці мэтазгодна сёння ісці ў банк па зямежную валюту або, наадварот, «скідваць» долары?

Бегчы ў абменнік я не параіў бы ў любым выпадку, бо прымаць сур'ёзныя рашэнні трэба з халоднай галавой. Аднак трымаць свабодныя грошы трэба абавязкова на рахунку або ў каштоўных паперах у банку, бо менавіта там яны не проста захоўваюцца, але і прыносяць даход. У далейшых падліках паспрабуем разабрацца ва ўзроўнях даходаў па розных схемах фінансавых укладанняў. І яшчэ. Ствараецца ўражанне, што, атрымаўшы магчымасць падняць стаўкі па ўкладах у рублях, банкі наўмысна зніжаюць прыбытковасць укладанняў у валюце...

### Дакладны тэрмін захоўвання

Уклады дзеляцца на дзве асноўныя катэгорыі — адзыўныя і безадзыўныя. Адзыўны дэпазіт афармляецца на пэўны тэрмін, але пры жаданні вы можаце ў любы момант забраць свае грошы, цалкам ці часткова. Калі вы здымаеце грошы датэрмінова, то працэнты налічваюцца і выплачваюцца за фактычны час захоўвання сродкаў па стаўцы, ніжэйшай за асноўную.

СТАР. 4



КОРАТКА

**Кошт жылля ў абласных цэнтрах прыкладна ў два разы ніжэйшы, чым у Мінску. Сярэдняя цана 1 кв. м жылля ў сталіцы ў першым квартале бягучага года склала BYN2,3 тыс. У Брэсце сярэдняя цана «квадрата» — BYN1,27 тыс. Гэта на 23 % вышэй, чым у Гомелі.**

Гібрыдная аперацыя на сасудах пры атэрасклерозе ног упершыню выканана ў Брэцкай абласной бальніцы.

**Зарэгістраваныя рэзідэнты маюць намер інвеставаць у праекты Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку «Вялікі камень» паўмільярда долараў.**

Сталічная служба занятасці падагульніла сітуацыю на рынку працы за першы квартал 2018 года: 1 красавіка на аднаго зарэгістраванага беспрацоўнага прыходзілася 5,9 вакансіі.

**Генпракуратура выявіла парушэнні антыкарупцыйнага заканадаўства ў дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук і падпарадкаваных арганізацый. Так, у 2015—2017 гадах у падначаленых Акадэміі навук арганізацыях выкрыта 8 карупцыйных злачынстваў і 11 фактаў іншых парушэнняў заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй.**

## БЕЗ ХІСТАННЯЎ

**Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Ільхама Аліева з упэўненай перамогай на выбарах Прэзідэнта Азербайджана, паведамляе прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы.**

«Вынікі галасавання пацвердзілі высокую салідарнасць выбаршчыкаў з паслядоўным курсам на будаўніцтва моцнага і квітнеючага Азербайджана. Упэўнены, што Ваша дзейнасць на адказным пасту кіраўніка дзяржавы забяспечыць далейшае ўмацаванне эканамічнай моцы краіны і яе міжнароднага аўтарытэта, будзе садзейнічаць усебаковаму развіццю дружалюбных беларуска-азербайджанскіх адносін», — гаворыцца ў тэксце віншавальнай тэлеграмы.

Аляксандр Лукашэнка таксама пажадаў Ільхаму Аліеву моцнага здароўя, шчасця, невычэрпнай энергіі і поспехаў у рэалізацыі намечаных планаў.

Акрамя таго, паміж прэзідэнтамі адбылася тэлефонная размова. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі парадак дня двухбаковых адносін, стан і перспектывы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, кантакты на міжнароднай арэне. Адзначана высокая ступень даверу і ўзаемаразумення, якія характарызуюць беларуска-азербайджанскія адносіны, паведамляецца на афіцыйным інтэрнэт-партале Прэзідэнта Беларусі. У гандлёвым супрацоўніцтве краін апошнім часам назіраецца станоўчая дынаміка, і лідары падкрэслілі важнасць далейшых сумесных намаганняў у гэтым кірунку.

Пазачарговыя прэзідэнцкія выбары прайшлі ў Азербайджане 11 красавіка. Раніцай у чацвер Цэнтральная выбарчая камісія краіны паведаміла папярэднія вынікі пасля апрацоўкі практычна 100 % бюлетэняў: 83,06 % выбаршчыкаў аддалі свае галасы за Ільхама Аліева. Яўка выбаршчыкаў склала 74,3 %. Гэта чацвёртая перамога сына Гейдара Аліева, які ўзначальваў краіну з 1993 да 2003 года.

Барацьбу за галоўны дзяржаўны пост у Азербайджане вялі восем прэтэндэнтаў. Кандыдатура дзеючага Прэзідэнта была прапанаваная партыяй «Ені Азербайджан» («Новы Азербайджан»), якую ён узначальвае. Перамогу прызналі як сапернікі, так і міжнародныя назіральнікі, якія не выказалі прэтэнзій да ходу кампаніі і працэсу галасавання.

Новы прэзідэнцкі тэрмін у Азербайджане будзе доўжыцца сем гадоў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Зацікаўленасць — узаемная

**Рэгіёны Расіі — традыцыйныя гандлёвыя партнёры Беларусі. Толькі з Яраслаўскай вобласцю тавараабарот нашай краіны склаў летась 356,3 мільёна долараў, павялічыўшыся больш чым у два разы з 2015-га. Але і на гэтым не трэба спыняцца. Такая думка была выказана падчас учарашняй сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і губернатара гэтага суб'екта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Міронава.**


Фота БЕЛТА.

З Яраслаўскай вобласцю Беларусь родніць агульная гісторыя. У часы, калі беларусы ратаваліся ад бедстваў Першай сусветнай вайны і перажыдалі на іншых землях, адным з такіх куткоў стаў Яраслаўль. Менавіта там выдатны беларускі паэт Максім Багдановіч аказаўся разам са сваёй сям'ёй і большую частку творчага жыцця правёў у гэтым расійскім горадзе. А ў пасёлку Някрасаўскім сёлета адкрылі спартыўны комплекс у памяць аб загінулых гульцах і персанале хакейнага клуба «Лакаматыў». Сярод іх былі і беларусы, у тым ліку вядомы хакеіст Руслан Салей.

«Ваш рэгіён шмат у чым падобны з Беларуссю па структуры эканомікі. Ён заўжды быў важным гандлёвым партнёрам. Беларускія прадпрыемствы машынабудавання развіваюць дзелавыя кантакты з вытворцамі яраслаўскіх рухавікоў. У нас створаны тэхналагічныя ланцужкі ў станкабудаванні, нафтахіміі і іншых галінах», — кажа Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што нашы эканомікі не столькі канкуруюць паміж сабой, колькі гарманічна дапаўняюць адна адну. Таму вытворчая кааперацыя прадпрыемстваў выгадная абодвум бакам.

У хуткім часе ў Яраслаўскай вобласці плануецца перавесці пасажырскі аўтапарк на выкарыстанне газаматорнага паліва. Беларусь можа не толькі падзяліцца такім вопытам, але і стварэннем канкрэтных вытворчасцяў у гэтай галіне. Летась мадэрнізаваныя беларускім бокам машыны паступілі ў Маскву і Самару, заказы працягваюць паступаць і зараз. Да іх можа далучыцца і яраслаўскі бок, прапанаваў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь гатова арганізоўваць пастаўкі грузавой, дарожнай, пасажырскай, камунальнай, будаўнічай тэхнікі, ствараць сумесныя вытворчасці ў гэтых сферах, удзельнічаць у інфраструктурных праектах і дзяржаўных праграмах. І таксама гатова супрацоўнічаць у сферы сельскай гаспадаркі: расійскаму боку могуць быць цікавыя распрацоўкі ў жывёлагадоўлі, раслінаводстве, перапрацоўцы. У Яраслаўскай вобласці збіраюцца стварыць сырны кластар. І тут вопыт Беларусі можа быць да месца.

У сваю чаргу губернатар згадаў, што шмат у савецкі час яраслаўцаў удзельнічала ў будаўніцтве Мінскага аўтамабільнага завода. Зараз актыўна двухбаковыя кантакты развіваюцца і ў вышэйшай адукацыі, культуры. Па словах Дзмітрыя Міронава, беларуска-яраслаўскі тавараабарот летась вырас амаль у паўтара раза. Але гэтага мала, лічыць кіраўнік суб'екта Расійскай Федэрацыі, нашы сувязі ва ўсіх сферах могуць быць больш цеснымі. «Эканамічны патэнцыял Яраслаўскай вобласці пастаянна расце. Яраслаўскія прадпрыемствы гатовы ўдзельнічаць у мадэрнізацыі энергетычных сістэм Рэспублікі Беларусь, таксама супрацоўнічаць у вобласці машына-, дызелебудавання, пастаўляць дызельнае, энергетычнае абсталяванне», — прапанаваў ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

* * *

У той жа дзень з Дзмітрыем Міронавым сустрэўся прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў. Кіраўнік беларускага ўрада заявіў, што Беларусь зацікаўленая ў пашырэнні прамысловай кааперацыі з расійскім рэгіёнам.

«Кааперацыйнае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Яраслаўскай вобласцю можа быць значна больш глыбокім і шырэйшым», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Сення 70 % рухавікоў у тэхніцы Мінскага аўтамабільнага завода — яраслаўскай вытворчасці. Запатрабаваныя яны і на «Гомсельмашы».

Прэм'ер-міністр прапанаваў пашырыць гэты кірунак і выказаў пажаданне зрабіць яраслаўскія рухавікі больш канкурэнтаздольнымі. Яшчэ адной сферай для пашырэння супрацоўніцтва было названа станкабудаванне. Беларусь гатова прапанаваць Яраслаўскай вобласці шырокі спектр гарадской пасажырскай тэхнікі: аўтобусы, тралейбусы, трамваі, электробусы.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Урад

## КІРАЎНІКІ ПАЕДУЦЬ НА МАЛУЮ РАДЗІМУ

**На наступным тыдні, 21 красавіка, адбудзецца рэспубліканскі суботнік. Кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных ураду, выедуць у гэты дзень на сваю малую радзіму. Адпаведная інфармацыя размешчана ў пастанове Савета Міністраў ад 10.04.2018 № 276.**

У дакуменце таксама адзначаецца, што суботнік рэкамендавана правесці на добраахвотнай аснове ці на працоўных месцах, ці добраўпарадкуючы гісторыка-культурныя каштоўнасці, тэрыторыі населеных пунктаў, ці рыхтуючы дзіцячыя аздараўленчыя і спартыўна-аздараўленчыя лагеры да летняга сезона. Другім пунктам пастановы адзначаецца, што кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання і іншых дзяржарганізацый прымуць асабісты ўдзел у рэспубліканскім суботніку з выездам на сваю малую радзіму.

Пяцьдзясят працэнтаў грашовых сродкаў, зароблены на суботніку, застануцца ў распараджэнні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама і пойдуць на добраўпарадкаванне і прывядзенне ў належны стан населеных пунктаў, у тым ліку аграгарадкоў, мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы, пахавання воінаў і партызан Вялікай Айчыннай вайны, а таксама на падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых і спартыўна-аздараўленчых лагераў да летняга сезона.

Другая палова зароблены сродкаў пойдзе Міністэрству аховы здароўя на закупку медыцынскага абсталявання для сталічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі і арганізацыі ў ёй дадатковых кругласутачных пастоў, а таксама рэзервовых ложкаў на выпадак экстраннай шпіталізацыі ўдзельнікаў і гасцей II Еўрапейскіх гульняў 2019 года.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ГЕНЕРАЛЬНЫ САКРАТАР ААН ЗАЯВІЎ АБ РЫЗЫЦЫ ВЫХАДУ З-ПАД КАНТРОЛЮ СІТУАЦЫІ ВАКОЛ СІРЫІ

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш асцерагаецца, што сітуацыя вакол Сірыі можа стаць некантралюемай. Пра гэта гаворыцца ў яго заяве, распаўсюджанай прэс-службай сусветнай арганізацыі. «Я вельмі ўважліва сачу за развіццём сітуацыі ў Савеце Бяспекі ААН і шкадую, што ён пакуль не змог прыйсці да згоды па гэтым пытанні», — канстатаваў Гутэрыш. «Я зноў падзяліўся з пастаяннымі прадстаўнікамі пяці дзяржаў, якія з'яўляюцца пастаяннымі членамі СБ ААН, сваёй глыбокай заклапочанасцю адносна рызык, звязаных з бягучым тупіковым становішчам, а таксама падкрэсліў неабходнасць пазбегнуць выхаду сітуацыі з-пад кантролю», — заявіў ён. «Давайце не будзем забываць, што перш за ўсё нашы намаганні павінны быць накіраваны на спыненне страшных пакут сірыйцаў», — дадаў кіраўнік ААН.

### КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА БАРАЦЬБЕ З ТЭРАРЫЗМАМ МОЖА ПРАЙСЦІ Ў КАНЦЫ ГОДА Ў ТЭГЕРАНЕ

Міжнародная канферэнцыя па праблемах тэрарызму і міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння па супрацьдзеянні яму можа прайсці ў канцы года ў Тэгеране, заявіў спікер расійскай Дзярждумы Вячаслаў Валодзін. Пра гэта ён паведаміў у рамках двухбаковай сустрэчы са спікерам ніжняй палаты парламента Афганістана Абдулам Рауфам Ібрагімам. «Мы разглядаем магчымасць у канцы бягучага года зноў сабрацца, працягваючы папярэднюю канферэнцыю ў Ісламабадзе, ужо ў Тэгеране абмеркаваць пытанні тэрарызму, узняць пытанні бяспекі, нераспаўсюджвання наркотыкаў з удзелам нашых калег з Афганістана, Ірана, Ірака, Лівіі, Кітая і Сірыі», — сказаў Валодзін.

### ЛАГАРД НАЗВАЛА АБГРУНТАВАНЫМ РАШЭННЕ ПРА ЎКЛЮЧЭННЕ ЮАНЯ Ў КОШЫК ВАЛЮТ МВФ



Уключэнне юаня ў кошык спецыяльных праваў запазычання (SDR) МВФ было абгрунтаваным рашэннем, узровень інтэрнацыяналізацыі кітайскай валюты будзе расці, заявіла кіраўнік Міжнароднага валютнага фонду Крысцін Лагард у інтэрв'ю выданню South China Morning Post. «Узровень інтэрнацыяналізацыі кітайскай валюты крыху знізіўся, але зараз ён зноў пачынае расці, і чакаецца, што гэты рост працягнецца», — заявіла Лагард. Паводле яе слоў, факт прызнання юаня МВФ паспрыяў таму, што цэнтрабанкі і іншыя фінансавыя апаратары сталі разглядаць юань «як адну з валют міжнароднага значэння».

■ Супрацоўніцтва

## Дні Мінска пройдуць у Будапешце

**З 19 да 22 красавіка ў сталіцу Венгрыі адправіцца вялікая беларуская дэлегацыя, дзе абмяркуюць эканамічныя стасункі паміж дзвюма краінамі. Але не абыдзецца і без абмену досведам у сферы гарадской гаспадаркі, а таксама творчага вечара — сваю канцэртную праграму пакажа калектыў «Харошкі».**

Як **расказаў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр КРАПАК**, адным з галоўных мерапрыемстваў стане беларуска-венгерскі бізнес-форум. Летась тавараабарот паміж дзвюма краінамі склаў больш за 82 мільёны долараў, што амаль на 17 % больш, чым у папярэднім годзе. Венгерскі бок цікавяць беларускія трактары, лесаматэрыялы, фанера... Летась спіс дапоўнілі судны, тканіны, шыны, тэлефоны і іншае. У Мінск з Будапешта прывозяць фармацэўтычную прадукцыю, тэхніку, аўто, з нядаўняга часу расліны, садавіну, арэхі, ацяпляльныя катлы і масажныя апараты. На днях Мінска ў Будапешце сваю прадукцыю пакажуць вядучыя сталічныя прадпрыемствы.

Чакаецца, што ў гэты перыяд старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац і мэр Будапешта Іштван Тарлаш правядуць перамовы аб пашырэнні далейшага супрацоўніцтва.

Дарэчы, будуць умацоўвацца сувязі не толькі паміж гарадамі, але і асобнымі тэрытарыяльнымі адзінкамі. Так, плануецца падпісанне пагаднення паміж 21-м раёнам Чэпел Будапешта і Партызанскім раёнам Мінска. Супрацоўніцтва асабліва цікава тым, што Чэпел валодае пэўнай аўтаноміяй унутры горада, а Партызанскі раён адзін з вядучых у плане прамысловасці ў Мінску.

Падчас візіту таксама запланавана наведванне дыспетчарскага цэнтра метрапалітэна, цэнтральнай водаачышчальнай станцыі і кампаніі, якая рэалізуе ў Будапешце праект «Разумны горад».

**Дар'я КАСКО**

**У Мінску і абласцях працягваюць сваю работу прамыя тэлефонныя лініі**

Нагадаем, што задаць усе хвалюючыя пытанні можна кожную суботу з дзевяці раніцы і да поўдня. Адказваць на іх будуць намеснікі старшыняў абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама кіраўнікі спраў. Чарговая прамая тэлефонная лінія пройдзе ў суботу, 14 красавіка, на сувязь з насельніцтвам выйдуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ВЯЛІЧКА. Тэл. 8-016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8-021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ. Тэл. 8-023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8-015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8-022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8-017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8-017 222 44 44.

■ Кадры

# МАЛАДЫЯ І ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ

## Хто яны, будучыя кіраўнікі рэгіёнаў?

**Эканамісты, супрацоўнікі сацыяльнай, аграрнай і камунальнай сфер ва ўзросце да 40 гадоў — найлепшыя з найлепшых — складаюць спецыяльную групу рэзерву кіруючых кадраў. Удзел у семінары «Рэгіянальныя кадры як стратэгічны рэзерв вертыкалі кіраўніка дзяржавы» ўзялі 74 пераможцы адмысловага конкурсу з усёй краіны.**



Фота БЕЛТА.

У праграме — практычныя заняткі ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь з удзелам кіраўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады. Адной з самых значных і хвалюючых для спецыялістаў стала сустрэча з **Наталляй КАЧАНАВАЙ, кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта**. Для многіх з іх Наталля Іванаўна — прыклад. Калісьці яна кіравала Навапалацкім гарвыканкамам, а сёння — займае адну з найвышэйшых дзяржаўных пасад.

Кіраўнік Адміністрацыі выказала свае чаканні ад маладых кадраў: «Гэта тыя людзі, якія адданыя сваёй краіне, адданыя той палітыцы, якая праводзіцца. А ў тым, што гэтая палітыка абсалютна правільная, я пераканана. Я бачу і разумею, наколькі сёння няпроста нашай краіне і ўнутры, і ў знешніх умовах выстаяць і захаваць незалежнасць і суверэнітэт».

Сутнасць праекта — стварыць новы, рэгіянальны ўзровень кадравага рэзерву кіраўнікоў. Каб адабраць кадры, якія будуць вырашаць, калі не ўсё, то многае, з 225 прэтэндэнтамі правялі тэсціраванне і гутарку. Кандыдаты паказалі свае веды ў сферы псіхалогіі кіраўніцтва, заканадаўства і работы з насельніцтвам. Іспыты паспяхова вытрымала трэць кандыдатаў.

— Больш за тры гады я працаваў на пасадзе кіраўніка сельскагаспадарчага прадпрыемства. Пэўныя поспехі ў рабоце гэтага прадпрыемства ёсць — прырост валавой прадукцыі і паляпшэнне іншых паказчыкаў. Плюс адказнае стаўленне да справы. Усё гэта дало падставу для службовага павышэння. Станоўчая дынаміка ў развіцці аграпрамысловага комплексу Лепельскага раёна стала нагодай для галоўнага ўпраўлення кадравай работы аблвыканкама рэкамендаваць мяне ў групу рэзерву, — расказаў **Міхаіл КІСЯЛЕВІЧ, першы намеснік старшыні Лепельскага райвыканкама.**

Адукацыйны семінар — пілотны праект. Ці будзе ён укаранёны ў практыку, пакажа яго эфектыўнасць.

— Крытэрый просты — павышэнне якасці мясцовага кіраўніцтва. Не сакрэт, што галоўны вынік працы любога кіраўніка — гэта давер людзей да ўлады. Мы павінны вучыцца працаваць з людзьмі. Гэта адносіцца да ўсіх сфер — рамонту дарог, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, адукацыі ці іншых, — падкрэсліў **Марат ЖЫЛІНСКІ, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

Другое жыццё ў рамках праекта атрымала і традыцыя настаўніцтва. Па словах Марата Жылінскага, за кожным рэзервістам будзе замацаваны настаўнік з ліку вышэйшага кіраўніцтва аблвыканкамаў і гарвыканкамаў.

**Марыя ДАДАЛКА**

■ Надвор'е

# Магчымы першыя навальніцы

## А ў панядзелак прыпячэ да плюс 24 градусаў

**На выхадных у нашай краіне зноў пацяплее, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу паўднёва-заходнія раёны краіны апынуцца пад уплывам атмасфернага фронту. Уначы ў некаторых раёнах Брэсцкай вобласці, а ўдзень пераважна па паўднёвым захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—8 градусаў, па паўночным усходзе нуль — мінус 2 градусы. Днём будзе ад плюс 13 да плюс 19 градусаў, па поўдні — да 20—22 цяпла.

У нядзелю ноччу на большай частцы тэрыторыі, а днём толькі ў некаторых раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—11 цяпла, удзень будзе плюс 14—20 градусаў, па поўдні месцамі паветра прагрэецца да плюс 21—23 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак і аўторак надвор'ем будзе кіраваць цёплая вільготная паветраная маса, якая наступае з Заходняй Еўропы. У некаторых раёнах не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай месцамі прагназуецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 цяпла, удзень чакаецца ад плюс 15 да 22 градусаў, а ў паўднёва-заходніх раёнах прыгрэе да 23—24 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ На слыху

# ПАРОМ ПРАХОДЗІЦЬ ТЭСТ

**Рух парома цераз Прыпяць у Жыткавіцкім раёне адкрыты ў тэставым рэжыме.**

Па інфармацыі РУП «Гомельаўтадар», напярэдадні ён паспяхова прайшоў выпрабаванні, былі завершаны неабходныя ўзгадненні. Паромная пераправа будзе дзейнічаць паралельна з дзеючым пантонным мостам. Пасля праходжання тэставага рэжыму складуць графік руху парома. Пры гэтым неабходна будзе ўлічыць многія фактары, у тым ліку тое, колькі часу спатрэбіцца для загрузкі і разгрузкі транспарту. За адзін рэйс паром даўжынёй 70 метраў і грузападымальнасцю ў адну тысячу тон здольны пераправіць 39 пасажыраў, а таксама 4-5 грузавых аўтамабіляў ці 20—25 легкавых.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЯК У БАБРУЙСКУ БАБРА РАТАВАЛІ



Сігнал паступіў з дзіцячага яслясадка № 59. Узрушаная выхавальніца паведаміла, што па тэрыторыі дзіцячага садка ўздоўж агароджы бегае бабёр і не можа самастойна выбрацца. Было незразумела, як жывёліна трапіла ў цэнтр горада, ды яшчэ прыкладна за 2 кіламетры ад найбліжэйшага вадаёма. Трэба ведаць, што для Бабруйска бабёр не проста жывёліна — гэта сімвал горада. Таму ратавальнікі з уласцівай ім адказнасцю паставіліся да справы. Як паведаміў **інспектар групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Бабруйскага гаррайаддзела па НС Аляксей САФРОНАЎ**, у аперацыі па адлове грызуна ўдзельнічалі таксама прыродаахоўнікі і работнікі «Спецаўтапрадпрыемства». На працягу гадзіны ратавальнікі забяспечвалі ахову месца дзеяння, каб працэсу не перашкаджалі старонія людзі. З дапамогай спецсродку бабёр быў злоўлены і дастаўлены ў звыклае для яго асяроддзе — на раку Бярэзіну.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ДАСТАЛІ ПЕНСІЯНЕРКУ З КАЛОДЗЕЖА

**У службу выратавання паступіла паведамленне пра тое, што патрабуецца дапамога ў выманні чалавека з калодзежа на тэрыторыі прыватнага домаўладання ў вёсцы Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна.**

— Першым да месца здарэння прыбыў у вольны ад нясення службы час ратавальнік Яўген Клімовіч, які жыве ў гэтым населеным пункце, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Яму стала вядома, што на дне калодзежа глыбінёй каля 12 метраў (узровень вады адзін метр) знаходзіцца пенсіянерка 1954 года нараджэння. Яе знайшоў муж, які і паведаміў пра здарэнне ў службу выратавання. Разам з мужам ратавальнік зняў надбудову студні. Работнікі МНС пастаянна падтрымлівалі размову з пенсіянеркай, каб яна не страціла прытомнасць. Прыбыўшыя падраздзяленні вынялі жанчыну і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Пацярпелая з траўмамі рознай ступені цяжкасці шпіталізавана ў Стаўбцоўскую цэнтральную раённую бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Тэхналогіі

# ГЛАБАЛЬНАЕ АБНАЎЛЕННЕ НАВІГАЦЫЙНАЙ КАРТЫ КРАІНЫ

## Колькасць населеных пунктаў з пошукам «да дома» вырасла ў 57 разоў

**Маштабнае абнаўленне карты было зроблена кампаніяй NAVITEL у супрацоўніцтве з навукова-вытворчым дзяржаўным унітарным прадпрыемствам «Нацыянальнае кадастравае агенцтва» (НКА), якое ўваходзіць у сістэму Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі. Інфармацыя пра тое, што для ўладальнікаў аўтанавігатараў гэтай кампаніі, а таксама карыстальнікаў праграмы «Навітэл Навігатар для смартфонаў і планшэтаў» стала даступная новая карта рэлізу Q1 2018, размешчана на сайце кампаніі.**




«Зручнасць работы з аўтанавігатарам напрамую звязана з якасцю картаграфічнага матэрыялу. Нам важна, каб карыстальнікам былі даступныя самыя актуальныя даныя, якім яны могуць давяраць, а гэта залежыць ад ступені напаўнення навігацыйна-значнай інфармацыяй, — адзначыў **кіраўнік групы кампаній NAVITEL Аляксандр КАЗАКОЎ.** — Дзякуючы Нацыянальнаму кадастраваму агенцтву мы змаглі стварыць па-сапраўднаму ўнікальную па дэталізацыі навігацыйную карту для нашых карыстальнікаў».

У рэлізе падкрэслена, што шматгадовае супрацоўніцтва дазволіла інтэграваць у навігацыйную карту кампаніі поўны рэестр будынкаў, транспартна-дарожныя сеткі і ўсю навігацыйна-значную інфармацыю. Поўная дэталізацыя абноўленай карты дае магчымасць карыстальніку атрымаць найбольш актуальную інфармацыю па ўсіх зарэгістраваных будынках, уключаючы новабудоўлі.

Была актуалізавана адрасная база гарадоў і паселішчаў, садовых таварыстваў і аграгарадкоў, што значна пашырыла аб'ём картаграфічных даных. Колькасць населеных пунктаў з пошукам «да дома» вырасла ў 57 разоў, а агульная колькасць адрасоў на карце перавысіла 2 мільёны. Да карты таксама далучаныя 3D-мадэлі значных аб'ектаў: славутасцяў, вакзалаў, цэркваў і стадыёнаў.

«Гэта сапраўды маштабнае абнаўленне навігацыйнай карты з выкарыстаннем адраснай інфармацыі, якая змяшчаецца ў адрасным рэестры нашай краіны, і адначасова пацвярджэнне таго, што сёння ў Беларусі ствараецца і развіваецца адна з найлепшых у свеце дзяржаўных аўтаматызаваных інфармацыйных адрасных сістэм, на аснове якой могуць не толькі інтэгравацца іншыя дзяржаўныя інфармацыйныя сістэмы, але і павышацца якасць кіравання тэрыторыямі і аказвацца паслугі па выкананні адміністрацыйных працэдур», — сказаў **генеральны дырэктар НКА Дзяржкаммаёмасці Андрэй ФІЛІПЕНКА.**

Падрабязная інфармацыя аб карце Беларусі Q1 2018 змяшчае: 284 747 км дарожнага графа; 27 410 населеных пунктаў, нанесеных на карту; 25 159 гарадоў і населеных пунктаў з адрасным пошукам; 2 062 936 унікальных адрасоў; 67 101 POI і 17 аб'ектаў у трохмерным малюнку.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Руплівым гаспадарам

# ШТО ПАСЕЕШ, ТОЕ І ПАЖНЕШ?

**Выбіраем насенне**

**Насенне не ўзышло? У вас вырасла не тая культура, якую хацелі? А можа, вы не атрымалі таго ўраджаю, на які разлічвалі? Даволі часта з усімі гэтымі праблемамі мы сутыкаемся зусім не таму, што агароднікі з нас дрэнныя — нас проста падвяло насенне.**

І адна з першых парад, якую чытачам «Звязды» далі ў Галоўнай дзяржаўнай інспекцыі па насеннаводстве, каранціне і абароне раслін — не набываць насенне «з рук», на стыхійных кірмашах, у прадаўцоў, што стаяць каля абочын дарог. Мала таго, што тут вы рызыкуеце набыць штосьці няякаснае, разам з такім матэрыялам можна занесці хваробы і шкоднікаў.

Не варта набываць насенне праз інтэрнэт, па пошце. Наўрад ці ў віртуальнага прадаўца вы зможаце азнаёміцца з дакументамі на пакупку. І дзе гарантыя, што вам дашлюць менавіта тую культуру, прывабны малюнак якой так вас зацікавіў на экране камп'ютара ці ў яскравым буклеце? Наогул, у фотошопе сёння можна стварыць любую выяву, напрыклад прыдаць кветкам такі колер, якога не існуе. Калі ж вы атрымаеце дрэнны тавар, часам выказаць прэтэнзіі немагчыма, бо віртуальныя прадаўцы часта не ўказваюць свой юрыдычны адрас, а пазначаюць толькі абаненцкую скрыню.

Каб збыць свой тавар, гандляры часам ідуць на розныя хітрыкі. Напрыклад, пішуць на этыкетках назвы запатрабаваных сартоў. Часам яны атрымліваюць сортасумесь, а пасля расфасоўваюць тавар па больш дробных упакоўках і пазначаюць пэўныя назвы сартоў. Асабліва часта такую хітрасць выкарыстоўваюць гандляры кветкамі. Калі ў вас выраслі, напрыклад, цюльпаны не таго колеру, на які вы разлічвалі, даказаць, што вас падманулі ў пэўнай краме, не атрымаецца. Хоць некаторыя вытворцы запэўніваюць: калі нешта не так з пасадачным матэрыялам, яны гатовы замяніць яго. Але хутчэй за ўсё так робяць толькі буйныя «гульцы», якія даражаць рэпутацыяй. А дробныя прадаўцы ці «перакупы» наўрад ці пойдуць вам насустрач... Але выявіць такія парушэнні можна, калі запатрабаваць у прадаўцоў дакументы перад пакупкай тавару.

Зразумела, сутыкнуцца з падобнымі праблемамі можна ў любой гандлёвай кропцы, але, майце на ўвазе, у буйных цэнтрах, якія прапануюць насенне, пастаянна праводзіцца маніторынг.

— Мы займаемся пытаннямі кантролю якасці насення, якое вырабляецца ў нашай краіне і паступае сюды з-за мяжы; удзельнічаем у распрацоўцы нарматыўна-прававых дакументаў, якія рэгулююць пытанні насеннаводства, — расказвае **Валяр'ян САРСАНІЯ, начальнік дзяржаўнай інспекцыі па насеннаводстве.** — У кожнай вобласці, раёне ёсць падведамасныя арганізацыі, якія займаюцца вызначэннем пасяўных і сартавых якасцяў. Яны



аснашчаны лабараторным абсталяваннем і па выніках даследаванняў выдаюць дакументы, што пацвярджаюць якасць насення.

— Пакупнікі павінны быць больш уважлівымі, яны маюць права папрасіць дакументы на такі тавар! Калі ж прадавец пачынае выкручвацца, гаварыць, што забыў паперы, не можа іх знайсці, ці шукае нейкія адгаворкі, гэта падстава ўсумніцца ў тым, што насенне якаснае. Між іншым, з праблемамі, звязанымі з якасцю насення, адсутнасцю дакументаў на яго, можна звярнуцца ў тэрытарыяльныя інспекцыі (пажадана запыт рабіць у пісьмовай форме). Таксама парушэннем з'яўляецца рэалізацыя нераянаваных сартоў. Так, апошнім часам усё больш скаргаў паступае ад садаводаў, якія набываюць малдаўскія саджанцы. Паўднёвыя сарты пладовых больш цеплалюбныя, пад нашы кліматычныя ўмовы яны могуць не падысці і вымерзнуць. Акрамя таго, разам з саджанцамі ёсць вялікая рызыка занесці хваробы, у тым ліку каранцінныя. Не трэба маўчаць, калі вы бачыце, што рэалізуецца «праблемны» тавар. Можна ўзяць частку хворай расліны, злавіць шкоднікаў і звярнуцца ў дзяржаўную раённую інспекцыю па насеннаводстве, каранціне і абароне раслін. Магчыма, такім чынам вы папярэдзіце сур'ёзныя праблемы не толькі на сваім участку.

Руплівым гаспадарам трэба ведаць, што перш, чым набываць насенне, варта паглядзець, ці ёсць пэўная культура ў дзяржрэестры. Часам прадавец, каб завабіць спажыўца, можа напісаць на пакецiку экзатычную назву. Альбо пад рознымі назвамі прадаваць насенне аднаго і таго ж сорту.

Акрамя таго, у дзяржрэестры пазначана, у якіх рэгіёнах найлепш вырошчваць пэўныя сарты.

— Калі сарты ўключаны ў рэестр, гэта азначае, што яны прайшлі дзяржаўнае выпрабоўванне і паказалі сябе на ўзроўні стандарту альбо яго перавысілі, — заўважае **начальнік аддзела па інспектаванні насеннаводства Андрэй ПЯЧКОЎСКІ.** — Інфармацыю пра сарты, якія ёсць у дзяржрэестры, можна атрымаць на сайце Дзяржінспекцыі па выпрабоўванні і ахове сартоў раслін sorttest.by. Таксама тут можна паглядзець, да якой групы адносіцца пэўны сорт — ранняя- (сярэдня-, позна-) спелай. Наогул гаспадарам найперш трэба азнаёміцца з пэўнай літаратурай, паглядзець, што ёсць у продажы, вызначыцца з тым, што яны хочуць атрымаць, і толькі пасля набываць насенне. Важна ўлічваць і тое, што розныя сарты патрабуюць пэўных умоў, тэхналогій.

***— Нават у тым, што насенне не ўзышло, таксама можа быць вінаваты сам агароднік?***

— Сапраўды, розныя фактары могуць уплываць на ўсходжасць насення (напрыклад, прыродна-кліматычныя). Шмат залежыць ад агратэхнікі. Важна і тое, як захоўвалася насенне.

***— Атрымліваецца, лепш не набываць насенне ў запас?***

— Калі насенне апрацавана хімічнымі прэпаратамі, праз пэўны час такія прэпараты могуць уплываць на яго, усходжасць зменшыцца.

Часам вытворцы хітраць, указваюць, напрыклад, што тэрмін прыдатнасці насення да 2020 года. Але па законе дакумент, які гарантуе якасць насення, не можа выдавацца на 3-4 гады. Так, на агародныя культуры тэрмін дзеяння пасведчання 8 месяцаў! На пладовыя культуры ўсталяваны два тэрміны (таму што людзі набываюць саджанцы вясной і восенню), дакумент выдаецца на паўгода. Гэта зроблена, каб засцерагчы ад небяспекі пакупніка, раптам прадавец выкапаў саджанцы, у пэўны сезон не прадаў іх, а пакуль ён стаяў на кірмашы, карані раслін маглі пашкодзіцца, падсохнуць. Таму прадавец павінен прайсці паўторныя праверкі, каб выставіць тавар на продаж.

***— На якую інфармацыю на пакецiку насення трэба яшчэ звярнуць увагу?***

— Ёсць пэўныя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да маркіроўкі насення. Так, павінны быць указаны культура, сорт, найменне прадаўца. На сумесі насення распісваецца, з чаго яна складаецца ў працэнтных суадносінах. Асабліва гэта датычыцца газонных траў. Таксама павінен быць указаны дакумент, які пацвярджае якасць. Часам на пакецiках пішуць, што насенне праверана Галоўнай інспекцыяй, але насамрэч такая спасылка — маркетынгавы ход, бо такія аналізы праводзяць толькі абласныя і раённыя інспекцыі. Калі насенне пратраўленае, на ім трэба пазначыць, які хімічны прэпарат пры гэтым выкарыстоўваўся. А вось жорсткіх патрабаванняў, што на пакецiках павінна змяшчацца інфармацыя пра тое, ці раянаваны сорт, няма. Але часам самі вытворцы наносяць такі надпіс.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

# КІРУЕМ ЗБЕРАЖЭННЯМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Безадзыўныя ўклады, наадварот, чакаюць свайго часу. Вы ўносіце грошы на дэпазіт і забіраеце іх толькі па заканчэнні таго тэрміну, які пазначаны ў дагаворы. Сітуацыі бываюць розныя, і ў форс-мажорных абставінах банк можа пайсці вам насустрач і датэрмінова вярнуць грошы, але для гэтага патрэбны важкія падставы. Банк абавязкова разгледзіць ваша пажаданне, але дасць згоду толькі ў тым выпадку, калі палічыць вашыя аргументы вельмі сур'ёзнымі. Стаўкі па безадзыўных дэпазітах заўсёды прывабнейшыя і вышэйшыя. Давайце параўнаем: гадавая стаўка банка адзыўнага ўкладу на 5 месяцаў — 5 %, безадзыўнага — ужо 10 %. Адрозненні будуць заўсёды, незалежна ад тэрміну, на які вы кладзяце свае грошы ў банк.

## Рублёвы лепшы, але ёсць нюансы

Традыцыйна ўклады дзеляцца і па тыпе валюты: можна адкрыць рублёвы або валютны дэпазіт, натуральна, стаўкі па першым заўсёды вышэйшыя. Напрыклад, максімальная стаўка, якую можна знайсці на ўклад у беларускіх рублях, — 10,5 % гадавых. Гэта безадзыўны дэпазіт тэрмінам на 12 месяцаў. Калі грошы вы збіраеце на працягу года для мэтавай куплі ў айчыннай валюце, то лепш аддаваць перавагу рублям.

Адразу выбраць дэпазіт з найбольшымі працэнтамі і на неабходны вам тэрмін бывае вельмі цяжка. Як толькі прыбытковасць вашага дэпазіту перавышае сярэдні працэнт, які дзейнічае па гэтых умовах, то тут жа ўключаецца механізм карэкціроўкі «ў часе». Дзейнічае ён вельмі проста. Над працэнтамі па дэпазіце ставіцца маленькая зноска, расшыфроўка якой прыводзіцца значна ніжэй у дагаворы. А на самай справе гэта значыць, што памер працэнтаў па ўкладзе ўстанаўліваецца ўпаўнаважаным органам банка і змяняецца банкам у аднабаковым парадку пасля папярэдняга паведамлення ўкладчыку. Вось так. Першапачаткова вам прапанавалі, скажам, 13 % гадавых, але пасля двух, трох месяцаў стаўка па дэпазіце значна памяншаецца. І ўсё законна. Трэба было цалкам чытаць дагавор і абавязкова тое, што пад зноскай. Стаўка выбрана вамі плаваючая.

Фіксаваныя стаўкі ёсць у сістэмных банкаў. Праўда, даход па іх значна ніжэйшы. Напрыклад, безадзыўны дэпазіт на адзін год мае на ўвазе толькі 7,5 % гадавых. Яшчэ пры выбары дэпазіту ёсць сэнс разабрацца, як банк будзе выплачваць працэнты па ўкладзе. Ёсць паняцце «капіталізацыя працэнтаў», яшчэ яго называюць «працэнты на працэнты». Калі ва ўмовах укладу значыцца, што існуе штомесячная капіталізацыя працэнтаў, то гэта значыць, што па заканчэнні месяца захоўвання налічаныя працэнты за адпаведны перыяд далучаюцца да сумы дэпазіту. А ў наступным месяцы працэнты налічваюцца ўжо на ўсю суму, якая ляжыць на вашым рахунку. Даход па дэпазіце з капіталізацыяй працэнтаў будзе вышэйшы, яшчэ большы ён будзе, калі працэнты выплачваюцца двойчы ў месяц.

## Такі ж фокус і з валютай

Зусім іншы варыянт атрымліваецца, калі вы плануеце паехаць летам за мяжу або ўжо доўгі час збіраеце грошы на нерухомасць. У гэтым выпадку вам, мабыць, лепш выбраць валютны ўклад, тут ваш выбар залежыць ад актуальнай на сёння доларавай інфляцыі. Працэнты па валютным укладзе невялікія — да 2 %.

Дакладней, 2 % гадавых — гэта максімум. Сярэдняя стаўка па доўгатэрміновых укладах складае ад 1 % да 1,5 %. Усё, што больш гэтай прапановы, — таксама трапляе пад дзеянне зноскі. Фіксаваныя, як правіла, першыя тры месяцы дэпазіту. Ды і працэнты там невялікія (0,5 % гадавых).

## Аблігацыі максімум 2,5 %

Знізілася даходнасць і па валютных аблігацыях. Яшчэ летась каштоўныя паперы ў валюце прыносілі іх уладальнікам нядрэнны даход. Уласныя валютныя аблігацыі сістэмных банкаў краіны прадугледжвалі спачатку 5,5 %, а потым 3,5 % гадавых. Сёння падобных каштоўных папер з такой даходнасцю ўжо няма.

Цяпер на фінансавым рынку з'явіліся бездакументарныя каштоўныя паперы і інтэрнэт-аблігацыі ў валюце пад 2,5 % гадавых. Аднак у насельніцтва яны пакуль вялікай папулярнасцю не карыстаюцца. Людзей сёння палохае той факт, што па гэтых каштоўных паперах у іх на руках ніякіх папяровых дакументаў не застаецца. А калі няма гэтай самай паперы, то і ў кліентаў часам узнікае ўражанне, што гарантыя вяртання іх грошай не зусім відавочная.

### ❍ У тэму

Дэпазіты ў валюце ў мінулым месяцы скараціліся на 66,1 мільёна долараў (для параўнання: за студзень гэтага года — на $14,1 мільёна, за снежань — на $36,2 мільёна, за лістапад мінулага года — на $17,1 мільёна, за кастрычнік — на $23,8 мільёна, за верасень — на $39,3 мільёна). На пачатак сакавіка ўклады ў валюце склалі 6 млрд 609,2 мільёна долараў.

Нагадаем, трэці год насельніцтва краіны застаецца чыстым прадаўцом наяўнай валюты. Беларусы ў лютым павялічылі чыстыя продаж наяўнай валюты больш чым у два разы ў параўнанні са студзенем да 217 мільёнаў долараў. Рост чыстага продажу адбыўся за кошт прыкметнага зніжэння цікавасці да куплі валюты. Калі продаж наяўнай валюты ў лютым знізіўся на 3,8 % у параўнанні з студзенем да 562,2 мільёна долараў, то купля валюты ўпала адразу на 37,5 %, да 345,2 мільёна долараў. За ўвесь мінулы год беларусы здалі 2,2 млрд долараў чыстымі наяўнымі. У 2016 годзе чысты продаж склаў больш за 2,4 млрд долараў, за два месяцы гэтага года — 249,3 мільёна долараў.

Інтэрнэт-аблігацыі — гэта аблігацыі для фізічных асоб, якія рэалізуюцца ў сістэме «Інтэрнэт-банкінг». Яны эмітаваныя ў бездакументарнай форме (гэта значыць, у выглядзе запісаў на рахунках аналагічна безнаяўным грашам) і з'яўляюцца «прасунутай версіяй» традыцыйных папяровых аблігацый.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Белгазпромбанк**
**Энергия твоего будущего!**

## Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2.
Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована
на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by
в разделе «Финансовые показатели»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 74 250 | 70 203 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 581 | 630 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 347 663 | 202 688 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 296 062 | 445 903 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 953 215 | 956 368 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 309 147 | 2 405 359 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 1 835 | 947 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 572 | 572 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 160 607 | 177 511 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 13 481 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 9 191 | 9 638 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 30 239 | 32 850 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **4 196 843** | **4 302 669** |
| | | | | | |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 708 563 | 709 278 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 2 865 882 | 2 986 759 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 102 991 | 77 640 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 612 | 137 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 81 197 | 32 360 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 3 759 245 | 3 806 174 |
| | | | | | |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 189 357 | 189 357 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 52 350 | 46 300 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 22 370 | 25 278 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 173 521 | 235 560 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 437 598 | 496 495 |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **4 196 843** | **4 302 669** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2018 год | 2017 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 84 820 | 75 335 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 32 266 | 33 706 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 52 554 | 41 629 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 23 740 | 12 653 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 5 520 | 2 672 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 18 220 | 9 981 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | (479) | (424) |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (749) | 78 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 7 629 | 13 200 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 442 | 604 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 10 244 | 7 173 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 2 753 | 1 403 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 59 670 | 38 560 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 1 797 | 1 813 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 8 659 | 18 925 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 4 225 | 1 269 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **4 434** | **17 656** |

Председатель правления В. Д. Бабарико
Главный бухгалтер Н. М. Дылевская
Дата подписания: 6 апреля 2018 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана
Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013. УНП 100429079



**УП «Белконфискат»
обьявляет о проведении электронных торгов
10.05.2018 г. по продаже имущества,
принадлежащего Острога Г. С.**

Легковой внедорожник MAZDA CX7, 2008 г. в., бензин, АКПП, кузов: JM3ER293580202811, начальной стоимостью 12 600 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНН 190431606



Утерянный студенческий билет УО МГПК филиала «БНТУ» на имя Афанасьева Артема Игоревича **№ ЛВ0405235** от 01.09.2016 г. **считать недействительным**



**КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»
сообщает, что 15 мая 2018 года в 12.00 по адресу:
г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 состоится повторный аукцион
по продаже имущества открытого акционерного общества
«Гроднорайагросервис»**

Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 3 капитальных строения (административное здание, кафе-бар, здание гостиницы), канализационную (фекальную) сеть, канализационную (ливневую) сеть, асфальтобетонное покрытие, ограждения, расположенный по адресу: **Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, д. Котра** на земельных участках с кадастровыми номерами 422086003101000107 площадью 0,2674 га и 422086003101000108 площадью 0,5114 га.

Начальная цена продажи – **105 975,21 рубля,** сумма задатка – **10 597,52 рубля.**

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **по 10 мая 2018 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 742095, 720546, 720537.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

УНП 590727594





## ЯК БЫЛО, ТАК І БУДЗЕ?

Гэтую гісторыю любіў расказваць мой свёкар. У шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя па камсамольскай пуцёўцы ён ездзіў падымаць цаліну. Ездзіў, вядома ж, не адзін — разам з землякамі, а той раз — нават з блізкім сябрам. У Кузьмы быў білет у суседні плацкартны вагон. Зайшоў ён туды, свае рэчы пакінуў, а сам — у тамбур, бо дужа пакурыць хацелася...

Адвёў душу, потым словам-другім перакінуўся з праваднiцай. А калі вярнуўся, то ўбачыў, што чамадана яго на месцы няма — укралі. «Што ж рабіць?» — задумаўся хлопец і вырашыў пайсці... пашукаць.

— Э-э, людзі, — галёкаў у кожным вагоне, — добром вас прашу: аддайце чамадан, а то будзе, як тады...

З гэткай вось нечаканай пагрозай Кузьма ўвесь цягнік абышоў, бо разумеў, што прыпынкаў яшчэ не было, нікто не выходзіў, значыць, злодзей ці зладзеі недзе тут і словы ягоныя чуюць...

Так яно і выйшла — чулі.

А перад тым яшчэ і паглядзелі, што нічога каштоўнага ў чамадане няма (так, пара адзежак, шмат сала ды кіло агуркоў). Не шкада і аддаць.

Карацей, прынеслі яму чамадан.

Кузьма нават не разлаваўся (падлеткі, які ў іх розум?), пальцам пагразіў ды перасцярог, каб дурнога больш не рабілі, бо грэх.

Хлопцы, як здавалася, з ім згадзіліся, але сыходзіць не спяшаліся: пераступалі з нагі на нагу — быццам хацелі нешта спытаць. І меншы такі асмеліўся:

— Дзядзька, а што раней з чамаданам было? — пацікавіўся ён. — Ну, тады...

— Тады? — перапытаў Кузьма цяжанька ўздыхнуўшы. — Тады, брат, укралі і не аддалі.

**Таццяна Халопіца,**
*в. Затур'я, Нясвіжскі раён.*

## «НЯЎДАЛАЕ» ПАЛЯВАННЕ

Некалі мы з сябрамі Раманам ды Міхасём былі заўзятымі паляўнічымі. На каго толькі не хадзілі!.. Але ж найперш — на птушку: з нецярпеннем чакалі адкрыцця сезона. Ды што там — нават святкавалі гэту падзею, бо да нас тады ўся краіна з'язджалася: паляўнічыя з Мінска, Гомеля, Салігорска...

І мы, вядома ж, не адставалі: загадзя чысцілі зброю, рыхтавалі «боеприпасы» і ўсё патрэбнае, каб не прамарудзіць тады, прыехаць першымі.

Дык вось: адкрываецца паляванне на качак — і якраз у суботу.

Мы надумалі, што паедзем у пятніцу, напярэдадні: прызначылі час і месца збору, выйшлі з кватэры. Стаім з Міхасём (яго жонка праводзіць), чакаем Рамана.

— І дзе яго ліха носіць? — пытаю ў сябра. А потым падмігваю і ціха (каб чуў толькі ён ды, мо, жонка яго) дадаю:

— Сёння ж нам трэба раней. Дзеўкі з Салігорска ўжо там, відаць. І чакаюць...

Прычакалі і мы: з'явіўся Раман. Міхась адвітаўся з жонкай — паехалі.

Далей усё па плане было: вогнішча, вячэра, вячэра, шчырыя размовы, гадзіна-другая на сон. І вось ён — доўгачаканы ранішні золак!

...Паляванне, трэба сказаць, было досыць удалае: бліжэй да абеду з багатымі трафеямі мы вярталіся дамоў.

А там жа свае традыцыі: трэба адразу наварыць шулюму (наварыстай юшкі з качак), сабраць за сталом сямейнікаў ды суседзяў, расказаць пра ўражанні.

— Многа сёлета качак, — хваліўся тады Раман, старанна «махаючы» лыжкай. — Ды і паляўнічых таксама... Шкада толькі, што з дзеўкамі асечка выйшла: не было іх — ні з Гомеля, ні з Салігорска.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 07.02.2018 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 18 апреля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Маршчына. Сякера. Шынель. Нанду. Балет. Агарак. Азарт. Мама. Холад. Ананім. Мара. Ясакар. Камень. **Па вертыкалі:** Буслянка. Алей. Штаны. Агонь. Юнга. Шуба. Ніл. Лат. Ака. Ева. Гам. Рамонак. Студзень. Зло. Касяк. Хмара. Амар. Ірак.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.14 | 20.07 | 13.53 |
| Віцебск — | 6.01 | 20.00 | 13.59 |
| Магілёў — | 6.04 | 19.58 | 13.54 |
| Гомель — | 6.04 | 19.51 | 13.47 |
| Гродна — | 6.29 | 20.22 | 13.53 |
| Брэст — | 6.33 | 20.19 | 13.46 |

## Месяц

*Апошняя квадра 8 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

*Пр. Івана, Засімы, Сафрона.*
*К. Віктара, Зянона, Юліяна.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +19..+21°С | КІЕЎ | +15..+17°С | РЫГА | +15..+17°С |
| ВІЛЬНЮС | +15..+17°С | МАСКВА | +8..+10°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ | +10..+12°С |

**Даты | Падзеі | Людзі**

**13 КРАСАВІКА**




**1649** год — мяркуемая дата стварэння абраза Маці Божай Будслаўскай (мастак невядомы), якую каталікі Беларусі шануюць як цудатворную святыню; захоўваецца ў Будслаўскім касцёле (Мядзельскі раён), пабудаваным у 1783 годзе.



**1693** год — заснавана Супрасльская друкарня. Дзейнічала да 1803 года пры Супрасльскім Дабравешчанскім манастыры (цяпер — тэрыторыя Польшчы). Арганізавана на базе Свята-Троіцкай віленскай базыльянскай друкарні. Тут было надрукавана звыш 420 выданняў, у тым ліку больш за 100 кірылічным шрыфтам. Сярод іх выданні на старабеларускай мове, буквары славянскай мовы, славяна-польскі «Лексікон», першы кірылічны помнік нотадрукавання. У афармленні кніг выкарыстоўваліся разнастайныя шрыфты, мастацкія ўпрыгожанні, наборны арнамент, фігурная ксілаграфія і гравюры на медзі. З сярэдзіны XVIII стагоддзя выпускала таксама перакладную навуковую і мастацкую літаратуру, арыгінальныя творы мясцовых аўтараў.

**1995** год — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў закон «Аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь». Першымі дзяржаўнымі ўзнагародамі краіны былі ўстаноўлены: медаль Героя Беларусі (найвышэйшая ступень адзнакі); ордэны Айчыны І, ІІ і ІІІ ступеняў, Воінскай Славы, Францыска Скарыны, Маці; медалі «За адвагу», «За працоўныя заслугі», «За бездакорную службу» І, ІІ і ІІІ ступеняў.




**1883** год — нарадзіўся Дзям'ян Бедны, рускі савецкі паэт, адзін з пачынальнікаў сацыялістычнага рэалізму ў паэзіі. Аўтар аповесці «Пра зямлю, пра волю, пра рабочую долю», паэмы «Галоўная вуліца», шматлікіх вершаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны выступаў з патрыятычнымі вершамі, антыфашысцкай сатырай, супрацоўнічаў у «Вокнах ТАСС». Памёр у 1945 годзе.

**1892** год — нарадзіўся сэр Роберт Уотсан-Уат, шатландскі фізік, вынаходнік радара (1935), які дазволіў стварыць першую ў свеце сістэму радыёлакацыйнага выяўлення самалётаў. Яго вынаходніцтва адыграла значную ролю ў барацьбе з налётамі гітлераўскай авіяцыі на Вялікабрытанію ў гады Другой сусветнай вайны. Памёр у 1973 годзе.

**1934** год — завершана аперацыя па выратаванні навуковай экспедыцыі пад кіраўніцтвам О. Шміта на параходзе «Чалюскін». Значэнне выратавальнай чалюскінскай аперацыі было настолькі вялікае, што менавіта за гэты подзвіг пастановай ЦВК СССР 16 красавіка 1934 года было заснавана ганаровае званне Героя Савецкага Саюза.

## УСМІХНЕМСЯ

**Жонка кажа, дасі сыну варанае яйка, але толькі бялок, жаўток ён не есць. Дзіва, мой сціk-дзэадарант еў, мыла адкусіў і жаваў, а вось жаўток ён не есць!**

Ведаеце, чаму парасяты і каровы на ўпакоўках сасісак і каўбас так радасна ўсміхаюцца? Таму што ведаюць — іх там няма.

**Як стаць дрэнным чалавекам, інструкцыя:**
**1. Пазычыць грошай.**
**2. Доўга чакаць.**
**3. Спытаць, калі аддадуць.**
**Гатова — вы мярзотнік.**

**«ООО «Техно Медиа Трейд»**
**объявляет о проведении закрытого конкурса на право заключения договора на оказание услуг, связанных с пересылкой и доставкой почтовых отправлений по территории Республики Беларусь**

Дата и место проведения заседания конкурсной комиссии и вскрытие конкурсных предложений участников **14 мая 2018 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, эт. «-1», к. 2.

Конкурсная документация предоставляется лицами, приглашенными ООО «Техно Медиа Трейд» и впоследствии изъявившими желание участвовать в конкурсе. Минимальная и предельная суммы договора не ограничены.

Победителем конкурса будет определен допущенный участник, предложивший наилучшие условия исполнения договора согласно критериям, указанным в конкурсной документации. Договор с победителем торгов подлежит заключению в тридцатидневный срок от даты утверждения результатов торгов.

УНП 691530538

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1431.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 красавіка 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

13 красавіка 2018 г. № 15 (448)





стар. 2

**Калі аптымізацыя, то разумная**





стар. 15

**У вернікаў засталіся пытанні**





стар. 16

**Любімая птушка нашага раёна**


ТЭМА ТЫДНЯ

# НАВЕДАЦЬ МЕСЦА СПАЧЫНУ, А НЕ СМЕТНІК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**МОГІЛКІ — месца, дзе з кожным годам становіцца ўсё больш «навасёлаў» і якое, як і буйныя гарады, з часам вычэрпвае ліміт на колькасць прыбылых. Пры гэтым праблемы абслугоўвання і ўпарадкавання гэтых тэрыторый застаюцца. Знаходзіць новыя землі для пахавання становіцца ўсё складаней, таму, мяркуюць спецыялісты, адказныя за месца апошняга спачыну чалавека, трэба рыхтавацца да думкі пра неабходнасць абавязковай крэмацыі. А яшчэ — часцей наведваць сваіх памерлых і прыбіраць участак, каб раптам не ўбачыць замест недагледжанай магілы падгалоўнік, а то і свабоднае месца для пахавання іншых.**


стар. 4


АКТУАЛЬНА

# Рэальнасць і магчымасці кааперацыі

**Нядаўна ў Рэспубліцы Беларусь абнавіўся склад мясцовых Саветаў дэпутатаў. Нававыбраным прадстаўнікам народа сумесна з выканаўчай уладай трэба будзе вырашыць шэраг пытанняў у галіне рэгіянальнай палітыкі, у тым ліку ў сельскай мясцовасці.**

## НЕ ТОЙ УЗРОВЕНЬ

Сёння, напрыклад, актуальнай праблемай з'яўляецца стварэнне эфектыўнай сістэмы абслугоўвання насельніцтва і малых формаў гаспадарання (асабістых падсобных гаспадарак грамадзян, фермерскіх гаспадарак і іншых суб'ектаў малога аграбізнесу) у сельскай мясцовасці. Гэтае пытанне было разгледжана ў лютым 2018 года на выязным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання і праўлення Беларускага саюза спажывецкіх таварыстваў *(далей — Белкаапсаюз)* у Паставах.

Галоўнай сеткай, якая абслугоўвае вёску і задавальняе попыт насельніцтва на тавары, работы і паслугі, у асноўным з'яўляюцца арганізацыі спажывецкай кааперацыі (Белкаапсаюза). Галоўны кірунак работы спажывецкай кааперацыі — гэта рознічны гандаль, доля якога за апошнія тры гады перавышае 70 % ад усёй яго дзейнасці. Вытворчасць прамысловай прадукцыі займае каля 10 %, нарыхтоўчая дзейнасць — 9 %, грамадскае харчаванне — 6 %, экспарт — 3 % і іншыя паслугі — 1 %.

Разам з тым узровень абслугоўвання насельніцтва і малых формаў гаспадарання на вёсцы застаецца недастатковым. Доля сельгаспрадукцыі, якая закупляецца ў гаспадарцы насельніцтва арганізацыямі Белкаапсаюза, нязначная і



**Сельскагаспадарчы кааператыў «Гіжэнскі аграрый» на сырнай ярмарцы ў г. Слаўгарад.**

складае па бульбе менш за 1 %, гародніне — 4—5 %, пладах і ягадах — 15—17 % ад аб'ёмаў, якія вырабляюцца ў гэтым сектары аграрнай эканомікі.

Асноўнымі прычынамі недастатковай работы нарыхтоўчай галіны спажывецкай кааперацыі на вёсцы з'яўляюцца: нізкія цэны на сельгаспрадукцыю, якія прапануе спажывецкая кааперацыя для дробных сельгасвытворцаў; недастатковая якасць прадукцыі, што выпрацоўваецца на ўласных падворках; высокія выдаткі і складанасць работы спажывецкай кааперацыі з дробным пастаўшчыком.

Акрамя таго, спажывецкая кааперацыя з-за шэрагу арганізацыйных, санітарных і іншых фактараў і ўмоў працы не можа ў поўнай меры задавальняць патрэбы дробных гаспадарак на вёсцы ў неабходных рэсурсах (мінеральных угнаеннях, сродках абароны раслін і жывёл, высакаякасных кармах, насенным матэрыяле, племянных жывёл, птушцы і іншым).

## САЮЗНІКІ І КАНКУРЭНТЫ

Сусветны і айчынны вопыт паказваюць, што альтэрнатыўнай формай і «саюзнікам» спажывецкіх таварыстваў у вырашэнні названых праблем з'яўляюцца іх «браты-канкурэнты» — сельскагаспадарчыя спажывецкія кааператывы. Мэта кааператываў заключаецца ў задавальненні малых формаў гаспадарання ў неабходных рэсурсах, эфектыўным збыце прадукцыі ўдзельнікаў і па выгадных цэнах. Такія кааператывы з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі. Яны не маюць на мэце атрымаць прыбытак для сябе — яны развіваюць прамыя сувязі з пастаўшчыкамі рэсурсаў і пакупнікамі сельгаспрадукцыі сваіх удзельнікаў, абмінаючы рознага роду перакупшчыкаў і гандляроў. Гэта дазваляе ўдзельнікам разам мінімізаваць выдаткі і павялічваць даходы кожнага.

У краінах Еўразійскага эканамічнага саюза (за выключэннем нашай краіны) дзейнасць сельскагаспадарчых кааператываў рэгулюецца спецыяльна прынятымі заканадаўчымі актамі. Гэта дазваляе дробным сямейным і індывідуальным гаспадаркам ствараць на добраахвотнай аснове розныя тыпы і віды кааператываў для ажыццяўлення забеспячэнскай, збытавой і іншай дзейнасці.

У Беларусі сёння працуюць 28 сельскагаспадарчых спажывецкіх кааператываў, у тым ліку агародніцкіх — 13, садаводчых — 2, жывёлагадоўчых — 3, пчалярскіх — 3, і 6 кааператываў згодна з іх статутнай дзейнасцю з'яўляюцца шматпрофільнымі.


стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Падыходзіць да законаў комплексна

### *Спікер верхняй палаты даў інтэрв'ю тэлеканалу*

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ даў інтэрв'ю тэлеканалу «СТБ». Ён адказаў на пытанні аб удасканаленні заканатворчай дзейнасці, законапраектах, якія будуць разгледжаны падчас вясенняй сесіі, значэнні Года малой радзімы.**



Фота БЕЛТА.

На думку спікера, варта больш актыўна звяртацца да пакетнага прынцыпу прыняцця законапраектаў. «Можна казаць аб комплексным падыходзе, пакетным прынцыпе для таго, каб нарматыўныя прававыя акты, якія прымаюцца Саветам Рэспублікі і, натуральна, Палатай прадстаўнікоў, працавалі на перспектыву і дазвалялі вырашаць пытанні сённяшняга дня», — лічыць ён. Акрамя пакетнага прынцыпу, Савет Рэспублікі ініцыюе яшчэ два падыходы да заканатворчасці, якія будуць садзейнічаць павышэнню якасці падрыхтоўкі законаў, — ацэнка рэгулявальнага ўплыву і правядзенне навуковай экспертызы.

Адказваючы на пытанне, ці не запатрабуе гэта большага часу для падрыхтоўкі законапраектаў, Міхаіл Мясніковіч сказаў: «Тут няма нейкай пагрозы, што можа стварыцца прававы вакуум, спатрэбіцца дадатковы час і гэтак далей. У нас у краіне сфарміравана нацыянальнае заканадаўства, у тым ліку тое, што рэгулюе эканамічныя адносіны. Таму база — яна ёсць. І зараз мы можам казаць аб паглыбленні асобных умоў гаспадарання».

## Банк дапаможа дасягнуць Мэт

### *Пра гэта расказала Мар'яна Шчоткіна*

**Зацверджаная Сусветным банкам рамачная стратэгія партнёрства з Беларуссю на 2018—2022 гады прадугледжвае праекты, накіраваныя на рэалізацыю Мэт устойлівага развіцця (МУР). Пра гэта ў інтэрв'ю БелТА заявіла намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, нацыянальны каардынатар па дасягненні МУР Мар'яна ШЧОТКІНА.**

У найбліжэйшыя пяць гадоў Сусветны банк накіруе на фінансаванне праектаў у Беларусі каля $570 млн. Сярод асноўных напрамкаў фінансавання — рост прыватнага сектара, садзейнічанне занятасці, павышэнне якасці камунальных паслуг, развіццё сістэмы вышэйшай адукацыі, мадэрнізацыя сацыяльных паслуг і іншыя.

«Усе гэтыя кірункі адпавядаюць Мэтам устойлівага развіцця, якія рэалізуе наша краіна, — адзначыла Мар'яна Шчоткіна. — Беларусь удзяляе сур'ёзную ўвагу вырашэнню практычных задач устойлівага развіцця. Узаемадзеянне з Групай Сусветнага банка стварае спрыяльныя ўмовы для эфектыўнай рэалізацыі Мэт. Акрамя таго, гэта дадатковая магчымасць вывучыць перадавы міжнародны вопыт у гэтай галіне».

## Лекавыя сродкі — з індыйскім капіталам

### *Дзе ў хуткім часе з'явяцца новыя і аднаўленыя фармацэўтычныя вытворчасці?*

**Рэалізацыю сумесных беларуска-індыйскіх праектаў у фармацэўтыцы курыруе старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны па супрацоўніцтве з Індыяй Міхаіл МЯСНІКОВІЧ. Аб ходзе выканання беларуска-індыйскіх праектаў у гэтай галіне паведамляецца на сайце верхняй палаты беларускага парламента.**

З удзелам індыйскіх кампаній у Беларусі будуць пабудаваны тры фармацэўтычныя заводы. Адзін з іх адкрые беларуска-індыйская кампанія «Навалок» у Скідзелі. Будаўніча-мантажныя работы па праекце выкананы на 95 %. Праводзіцца работа па арганізацыі паставак абсталявання. Агульны аб'ём прамых замежных інвестыцый у праект склаў $1,73 млн. Зараз таксама прапрацоўваецца пытанне аб перадачы кампаніі «Навалок» дадатковых плошчаў прадпрыемства «Белмедпрэпараты» ў Скідзелі — вытворчых памяшканняў і абсталявання ўчастка вытворчасці амінакіслот.

Яшчэ адзін праект рэалізуецца кампаніямі «Фарматэкс» і індыйскай «Хетэра». Ствараецца сумесная вытворчасць лекавых сродкаў па поўным цыкле. Плануецца арганізаваць выпуск антырэтравірусных, проціпухлінных лекавых сродкаў, антыдэпрэсантаў і іншых прэпаратаў, якія не выпускаюцца айчыннымі вытворцамі.

Акрамя таго, пры ўдзеле індыйскай кампаніі «Натка фарма Лімітэд» ствараюцца сучасныя фармвытворчасці ў г. п. Бешанковічы Віцебскай вобласці для выпуску па поўным цыкле біятэхналагічных прадуктаў і генерычных лекавых сродкаў. Арыенціровачны кошт праекта — каля $15 млн. На прадпрыемстве плануецца выпрацоўваць больш за 30 найменняў лекавых сродкаў у розных формах: таблеткі, капсулы, растворы (ампулы і флаконы). У рамках праекта ўжо створаны навукова-вытворчы комплекс па выпуску генерычных лекавых сродкаў проціпухліннага прызначэння.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

НА ПРЫЁМЕ

# КАЛІ АПТЫМІЗАЦЫЯ, ТО РАЗУМНАЯ

**З ПРОСЬБАМІ пачысціць возера, не закрываць бальніцу, пабудаваць лазню, выплаціць заробак за адпрацаваны час і многімі іншымі звярталіся жыхары Гомельшчыны да памочніка Прэзідэнта Беларусі — інспектара па Гомельскай вобласці Юрыя ШУЛЕЙКІ і дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Мікалая ВАСІЛЬКОВА. Яны правялі сумесны прыём у Веткаўскім райвыканкаме.**

Некаторыя з наведвальнікаў нават пужаліся, калі бачылі дзясятак мясцовых чыноўнікаў: «Мы ж запісваліся да аднаго чалавека, а тут адразу столькі!..» Між тым прысутнасць адказных асоб цалкам апраўданая. Многія з іх давалі неабходныя даведкі, атрымлівалі даручэнні і нават выконвалі іх у лічаныя хвіліны. Напрыклад, палічылі бойлеры ў адным з дзіцячых садкоў і прыйшлі да высновы, што сапраўды іх трэба больш — як і прасіла жанчына па тэлефоне. Дарэчы, з яго дапамогай першую гадзіну ажыццяўлялася сувязь з грамадзянамі.

Падчас прамой лініі высветлілася, напрыклад, што ў адной з мясцовых арганізацый, якая знаходзіцца на мяжы банкруцтва, звольненым па ўзаемнай згодзе супрацоўнікам не выплачвалі заробак яшчэ са снежня. Юрый Шулейка ў гэтым выпадку быў катэгарычны і даў даручэнне вярнуць людзям зароблены грошы да канца гэтага тыдня.



Просьба пабудаваць лазню замест той, якая згарэла год таму, была агучана адразу некалькімі жыхарамі Веткі.

— Я думаю, у кожным раёне павінна быць дастойная паўнавартасная лазня, — адзначыў Юрый Шулейка. — Гэта сацыяльна важны аб'ект.

Некалькі пытанняў датычыліся добраўпарадкавання, у тым ліку жыхары аграгарадка Старое Сяло прасілі выратаваць возера, якое зарастае хмызняком. Насамрэч гэта старое рэчышча Сажа, якое сілкуецца падземнымі крыніцамі. На думку грамадзян, утрымаць ваду дапамагла б невялікая дамба, але справа ўпіраецца ў грошы. Юрый Шулейка даручыў высветліць, наколькі мэтазгодны праект па выратаванні вадаёма. У ліпені-жніўні будзе створана камісія, якая вывучыць сітуацыю і прыме рашэнне.

Парадак на зямлі актуальны заўсёды. І таму рэакцыя на паведамленні пра неабходнасць добраўпарадкавання невялічкіх вуліц адназначная: калі нельга па фінансавых прычынах пакласці асфальт, грэйдар можа дапамагчы заўсёды. Да таго ж у красавіку пройдзе два суботнікі, дзе людзі і самі паспрыяюць наведзенню чысціні і прыгажосці.

— Калі мясцовыя ўлады нешта людзям раней паабяцалі зрабіць, трэба выконваць, — кажа Юрый Шулейка. — Увогуле практыка правядзення сумесных прыёмаў разам з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў вельмі добрая. Былі пытанні па ахове здароўя, дзе я мог быць некампетэнтным, а вось Мікалай Андрэевіч Васількоў адразу ж праясніў сітуацыю.

Размова пра бальніцу ва Уваравічах, што ў суседнім Буда-Кашалёўскім раёне. Там узнікла пытанне аптымізацыі. Людзі, якія тэлефанавалі на прамую лінію, вельмі хваляваліся, што бальніцу закрыюць увогуле. Мікалай Васількоў, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, раней узначальваў галіну аховы здароўя на Гомельшчыне. Таму ён адказаў на гэта пытанне пашырана:

— Сёння аптымізацыя ў галіне аховы здароўя патрэбна. Яна павінна ісці па двух кірунках: аптымізацыя сеткі медустаноў і аптымізацыя штатнага раскладу. У Буда-Кашалёўскім раёне ёсць некалькі медыцынскіх устаноў. Але мы рэалісты: як на 2-3 тысячы насельніцтва ва Уваравічах ці ў Тураве (Жыткавіцкі раён) можна ўтрымліваць бальніцу на 100 ложкаў? Гэта эканамічна немэтазгодна. Ніхто не ставіць задачу цалкам ліквідаваць медустанову. Але трэба памяняць яе статус: цяпер будзе Уваравіцкая ўчастковая бальніца. Пры гэтым захаваецца ўвесь медыцынскі персанал і дыягнастычнае абсталяванне. Колькасць ложкаў не скарачаецца — частка з іх пераводзіцца ў ложкі сястрынскага догляду. Сёння ФАПы мы можам аптымізаваць, стварыўшы амбулаторыі ўрача агульнай практыкі ў радыусе 70 км вакол. А ФАПы, якія нерацыянальна функцыянуюць, прыйдзецца ліквідаваць. На Гомельшчыне цяпер 17 бальніц сястрынскага догляду. У іх ажыццяўляецца сацыяльны догляд за адзінокімі і хворымі. Можна іх перадаць сацыяльным службам. Стала актуальным і пытанне перынатальных цэнтраў. Стаіць задача паменшыць рызыкі смерці маці і дзіцяці, таму мы павінны аказваць дапамогу ў родах на больш высокім узроўні. Напрыклад, тэрыторыі вакол Гомеля ў радыусе 10 км можна перавесці на абслугоўванне ў абласным цэнтры. Але я супраць скарачэння дзіцячых ложкаў у раённых бальніцах — там павінна іх захоўвацца хоць бы дзесяць. Увогуле, аптымізацыя павінна быць разумнай і на карысць насельніцтву.

Між тым Юрый Шулейка і Мікалай Васількоў імкнуліся дапамагчы нават у выпадках, калі гэта было немагчыма. Напрыклад, веткаўчанцы Вользе Елізаранцы. Жанчына прасіла пераразлічыць суму за прыватызацыю драўлянага дома, які раней быў службовым жыллём. Судовыя пасяджэнні прайшлі і былі не на карысць грамадзянкі. І ўсё ж было вырашана знайсці магчымасці і дапамагчы жанчыне, якая цяпер знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску па доглядзе чацвёртага дзіцяці і зусім нядаўна аўдавела.

Прыкладна палова са скаргаў была абгрунтаваная, рэзюмаваў Юрый Шулейка. А практыка сумесных з дэпутатамі прыёмаў грамадзян дазваляе пашырыць магчымасці для аператыўнага рашэння праблем людзей.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ПА СЛЯДАХ АДНАГО ЗВАРОТУ

# ДАРАГІЯ ЗАРАЗ ДАРОГІ

**На электронную пошту рэдакцыі прыйшоў ліст ад жыхара вёскі Дзявяткі Кобрынскага раёна Аляксандра Краўчука. Заяўнік піша, што ён інвалід другой групы, без нагі, а дарогі да яго дома няма. Даехаць, асабліва вясной і восенню, цяжка. Шматлікія звароты ў розныя інстанцыі нічога не далі.**

Сітуацыю праясніў старшыня Залескага сельскага Савета Валерый ІВАНЮК. Кіраўнік сельвыканкама расказаў наступнае:

— Грамадзянін Краўчук мае дом у вёсцы Быстрыца. У названым населеным пункце ёсць і дарога, і ўсе неабходныя камунікацыі. Аляксандр Андрэевіч таксама скарыстаў свае правы спадчынніка і аднавіў дом на хутары вёскі Дзявяткі, узвёў там лазню, выкарыстоўвае дом як аграсядзібу, прымае гасцей. Да будынка вядзе палявая дарога, якую ніхто ніколі не планаваў рабіць гравійнай. А грамадзянін Краўчук піша ў розныя інстанцыі, і гэта яго права. Вось толькі на гэтым тыдні ў сельскі Савет зноў паступілі запыты па трох яго лістах, — падсумаваў старшыня сельвыканкама.

Можна зразумець жаданне аўтара допісу. Кожнаму хацелася б, каб да дома, нават калі ён у самай аддаленай вёсачцы альбо на хутары, была пракладзена дарога, лепш, вядома, асфальтаваная. Але на гэта трэба аграмадныя сродкі, якія бюджэт пакуль не ў стане выдаткаваць. Не так даўно мы пісалі пра тры кіламетры дарогі, якія чакаюць 200 жыхароў вёскі Гарадзечна Пружанскага раёна, дзе ёсць ферма, дзіцячы садок, царква, іншыя грамадскія аб'екты. Але і на гэты год, і на наступны кавалак дарогі ім не абяцаюць. Што ўжо казаць пра дарогу, якую чакае адзін чалавек.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Рэальнасць і магчымасці...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».*

Дзейнасць гэтых арганізацый рэгулюецца асобнымі нормамі Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (арт. 44, 116), Закона Рэспублікі Беларусь «Аб спажывецкай кааперацыі (спажывецкіх таварыствах, іх саюзах)», Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 студзеня 2009 г. № 1 «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання» і іншых нарматыўных прававых актаў.

Важным этапам у развіцці першасных формаў вертыкальнай кааперацыі ў сельскай гаспадарцы і сельскай мясцовасці стала ў свой час рэалізацыя мерапрыемстваў «Праграмы развіцця і падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак грамадзян на 2006—2010 гады» (зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 мая 2006 года № 681).

> «Разам з тым узровень абслугоўвання насельніцтва і малых формаў гаспадарання на вёсцы застаецца недастатковым.

Падчас рэалізацыі праграмы пры ўдзеле мясцовага фонду «Цэнтр падтрымкі сельскага развіцця і прадпрымальніцтва Столінскага раёна» (далей — мясцовы фонд) і метадычным суправаджэнні ДП «Інстытут сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі» ў сакавіку 2010 года шэсць грамадзян, занятых вытворчасцю агародніны ў вёсцы Велямічы (Столінскі раён), стварылі спажывецкі сельскагаспадарчы забеспячэнска-збытавы кааператыў «Вескоп». Да канца 2010 года колькасны склад членаў «Вескопа» павялічыўся да 12 чалавек. У 2012 годзе ўдзельнікам кааператыва стала яшчэ і ўнітарнае прадпрыемства мясцовага фонду «Сельская Століншчына». Зараз у склад кааператыва ўваходзіць 31 удзельнік.

У апошнія два гады ў кааператыве дамінавалі збытавыя аперацыі, а забеспячэнскія займалі нязначную долю ў структуры яго абаротаў. Акрамя таго, для паляпшэння збыту агародніннай прадукцыі членаў кааператыва і насельніцтва ў вёсцы Велямічы быў створаны і працуе рынак для аптова-рознічнага продажу сельгаспрадукцыі насельніцтва. Ставіцца задача павелічэння ў найбліжэйшы час членскага складу кааператыва да 50 удзельнікаў, вызначэння крыніц рэсурсаў для будаўніцтва сховішча для агародніны на 2500 тон і развіцця гандлёвых сувязяў з буйнымі сеткамі («Алмі», «Еўрагандаль» і іншымі).



Заснавальнікі сельскагаспадарчага кааператыва «Наш мёд».

У Слаўгарадскім раёне з 2013 года функцыянуе спажывецкі сельскагаспадарчы кааператыў «Гіжэнскі аграрый». Цяпер членамі кааператыва з'яўляюцца 18 чалавек, з іх 15 сыравараў. «Гіжэнскі аграрый» пры падтрымцы малых грантаў ПРААН у рамках заяўленай кааператывам ініцыятывы «Падтрымка хатняга сыраварства як альтэрнатыўнай формы занятасці мясцовага насельніцтва на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях паблізу ад іх» завяршае стварэнне двух кааператыўных участкаў для адраджэння традыцый дамашняга сыраварства. Адзін з іх размесціцца ў вёсцы Лясной, а другі — у аграсядзібе «Сырная» (вёска Гіжэнка). У вёсцы Лясной сыраварам бязвыплатна перадалі будынак крамы мясцовага райспажыўтаварыства, які не выкарыстоўваецца. На адной з пляцовак сыр будзе вырабляцца на вачах у турыстаў, а ў спецыяльнай зоне кааператыў будзе праводзіць майстар-класы па вырабе сыроў.

Сярод пчалярскіх кааператываў найбольш паспяховым з'яўляецца «Наш мёд» — ён аб'ядноўвае інтарэсы 27 пчаляроў Гродзенскай вобласці, якія ўтрымліваюць каля 2500 пчаласем'яў.

Кааператыў забяспечвае патрэбы ўдзельнікаў у цукры, тары і іншых таварах. Адкрыты два гандлёвых аб'екты па продажы прадукцыі пчалярства яго ўдзельнікаў у Гродне і Ваўкавыску. Штогод кааператыў праз сваю рознічную сетку рэалізуе ад 3 да 7 тон мёду, арганізуе семінары і навучальныя паездкі за мяжу па вывучэнні перадавога вопыту ў пчалярстве.

## А ПАДАТКІ МЕНШЫЯ

Такім чынам, асноўныя асаблівасці арганізацыі і функцыянавання сельскагаспадарчых спажывецкіх кааператываў заключаюцца ў наступным: кааператывы з'яўляюцца добраахвотнымі аб'яднаннямі самастойных сельгасвытворцаў, але не кааператывамі па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі; членамі кааператываў могуць быць фізічныя і юрыдычныя асобы, у тым ліку органы дзяржаўнага кіравання (мясцовыя выканкамы і інш.) і арганізацыі; асноўнай мэтай дзейнасці кааператываў з'яўляецца павелічэнне асабістых даходаў іх удзельнікаў шляхам ажыццяўлення кааператывам забеспячэнскіх, збытавых і іншых гаспадарчых аперацый; для дасягнення сваіх статутных мэт кааператывы могуць ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць шляхам продажу тавараў, выканання работ і аказання паслуг асобам, якія не знаходзяцца ў членстве; кааператывы могуць ствараць свае ўнітарныя прадпрыемствы, удзельнічаць у гаспадарчых таварыствах і з'яўляцца членамі іншых кааператываў (і іншае).

Развіццю сельскагаспадарчых спажывецкіх кааператываў і павелічэнню даходаў іх удзельнікаў спрыяе таксама падатковае заканадаўства. Так, узносы членаў некамерцыйных арганізацый не з'яўляюцца аб'ектамі падаткаабкладання. Тавары (работы, паслугі), якія перадаюцца членам кааператыва і набыты (выкананы, аказаны) за кошт членскіх узносаў, не з'яўляюцца аб'ектам падаткаабкладання па падатку на дабаўленую вартасць. Акрамя таго, згодна з заканадаўствам аб абавязковым сацыяльным страхаванні спажывецкія кааператывы (акрамя спажывецкіх таварыстваў Белкаапсаюза) выплачваюць абавязковыя страхавыя ўзносы ў памеры толькі 12 % ад фонду аплаты працы (іншыя працадаўцы — 35 %, сельскагаспадарчыя арганізацыі — 29 %).

Такім чынам, зараз ёсць магчымасці для развіцця на сяле розных відаў сельскагаспадарчых спажывецкіх кааператываў, якія могуць стаць трывалай апорай для павышэння эфектыўнасці абслугоўвання сельскага насельніцтва. Развіццё такіх кааператываў прадугледжана падпраграмай 10 «Развіццё і падтрымка малых формаў гаспадарання» Дзяржаўнай праграмы развіцця аграрнага бізнесу на 2016—2020 гады, зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11 сакавіка 2016 года.

> Разам з тым асноўнай перашкодай у стварэнні і дзейнасці такіх арганізацый з'яўляецца псіхалагічны бар'ер, а хутчэй недахоп ведаў у насельніцтва ў галіне сельскагаспадарчай кааперацыі.

Для пераадолення гэтай праблемы рашэннем Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Інстытуту сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі прапанавана распрацаваць і да канца 2018 года апублікаваць Метадычныя рэкамендацыі па стварэнні і дзейнасці сельскагаспадарчых спажывецкіх кааператываў з улікам дзейнага заканадаўства і практыкі работы такіх арганізацый у Рэспубліцы Беларусь.

Зараз перад заканадаўцамі краіны стаіць пытанне пра неабходнасць падрыхтоўкі і прыняцця спецыяльнага айчыннага заканадаўства ў галіне прававога забеспячэння дзейнасці сельскагаспадарчых кааператываў. Акрамя спажывецкіх, у Беларусі існуюць каля 40 сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў, з якіх 31 кааператыў функцыянуе на базе (ці ў статусе) былых калгасаў (арцеляў), створаных у перыяд калектывізацыі. Для гэтага Мінсельгасхарчу сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук прапанавана вывучыць практыку прымянення заканадаўства аб сельскагаспадарчых кааператывах у краінах блізкага і далёкага замежжа і ўнесці адпаведныя прапановы пра неабходнасць прызнання спецыяльнага прававога статусу сельскагаспадарчых кааператываў.

**Аляксандр КАЗАКЕВІЧ,**
**загадчык сектара ўпраўлення рэгіянальнай палітыкі і мясцовага самакіравання Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.**

ТОЛЬКІ ПРАЦУЙ!

# УМОВЫ — ТУТ І ЦЯПЕР

**НАВІНА пра тое, што беларусы, якія афіцыйна не працуюць і не займаюцца легальным бізнесам, будуць поўнасцю аплачваць камунальныя паслугі, актыўна абмяркоўваецца ў краіне. І, бадай, у першую чаргу тымі, хто, мякка кажучы, па-за афіцыйным рынкам працы. На Віцебшчыне, дарэчы, апошнюю знайсці не праблема. Было б жаданне. І гэта пацвярджае статыстыка. Паводле інфармацыі на пачатак года, на ўліку ў службе занятасці было зарэгістравана каля 3,5 тысячы беспрацоўных, а колькасць вакансій перавышала 4,6 тысячы (прыкладна ў два разы больш, чым год таму).**

## «Некалькі прыпынкаў? Далёка!»

Іншая справа, што канкрэтныя грамадзяне не хочуць сумленна зарабляць сабе на жыццё. І, калі ім прапаноўваюць працу, даводзяць сітуацыю да абсурду.

**Губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ** прывёў цікавы прыклад. У Віцебску былыя работнікі буйнога прадпрыемства лёгкай прамысловасці «КІМ» адмовіліся ад новага месца працы. У ліку іншага і таму, што да яго трэба было трохі праехаць на грамадскім транспарце.

«Раней было зручней: некалькі хвілін пешшу з дома!» — такую прэтэнзію агучылі незадаволеныя грамадзяне афіцыйным асобам, якія стараліся ім дапамагчы.

Прадпрыемства прызналі банкрутам. Дык што рабіць? Чакаць цуду «рэінкарнацыі»? Наогул, тыя, хто займаецца працаўладкаваннем, часта чуюць адмовы накшталт: «Не жадаю!», «Не для мяне!», «Перавучвацца не збіраюся», «Хачу як раней!».

Але і з такімі «патрабавальнымі кадрамі» старшыня Віцебскага аблвыканкама папрасіў настойліва гутарыць, пераконваць. Тым больш што ў абласным цэнтры знайсці сабе працу прасцей.

У цэлым па вобласці сярэднестатыстычны беспрацоўны — гэта мужчына, якому прыкладна 44,5 года. У яго прафесійна-тэхнічная адукацыя, і яго звольнілі па пагадненні бакоў.

## Новыя працоўныя месцы

Тэма працаўладкавання абмяркоўвалася нядаўна на сумесным пасяджэнні прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і аблвыканкама.

**Аляксандр ХРЫСТАФОРАЎ, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама,** канстатаваў, што наймальнікі летась, у параўнанні з пазамінулым годам, больш актыўна шукалі кадры. Павялічылася колькасць наваствораных працоўных месцаў — летась іх занялі каля 6,5 тысячы чалавек. Дарэчы, на Віцебшчыне адпаведнае ўрадавае заданне выканалі на 112 %.

Каб жыхары вобласці былі запатрабаванымі на рынку працы, арганізавалі навучанне больш як 1,4 тысячы грамадзян. У аплатных грамадскіх работах бралі ўдзел каля 6,9 тысячы чалавек. Для каля 4,5 тысячы прадстаўнікоў навучэнскай моладзі забяспечылі так званую часовую занятасць...

## Сёння — маленькія, заўтра...

Летась прыкладна 230 беспрацоўным аказалі садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай і рамесніцкай дзейнасці. Кіраўнікі абласной вертыкалі чакаюць актывізацыі бізнес-ініцыятывы, а дзеля гэтага неабходна падтрымка з боку мясцовай улады — і не для справаздачы.

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** падкрэсліла, што пачаткоўцам у бізнесе трэба падставіць не плячо, а два плячы.

— Будучыня за новымі тэхналогіямі, за малым бізнесам, — сказала яна.

Член урада заклікала старшынь райвыканкамаў максімальна дапамагаць малым прадпрыемствам, якія пачалі дзейнасць у апошнія некалькі гадоў. А для тых, хто толькі распачынае сваю справу, трэба зрабіць усё магчымае, каб яны хутчэй сталі выраблялць прадукцыю, аказваць паслугі. Стаўка на падтрымку малога бізнесу — гарантыя таго, што ў рэгіёнах будуць стварацца дадатковыя працоўныя месцы, з'явіцца больш плацельшчыкаў падаткаў. Бо вопыт паказвае, што нярэдка там, дзе ўпачатку працуюць пара-тройка чалавек, з часам іх колькасць павялічваецца ў разы. Плюс малога прадпрымальніцтва ў тым, што моладзь, як самая актыўная частка грамадства, зможа рэалізаваць там сваю дзелавую ініцыятыву. І эфект, калі стварыць прывабныя ўмовы, будзе вялікі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НАВЕДАЦЬ МЕСЦА СПАЧЫНУ...

## Навошта тут вартаўнік?

Могілкі сталіцы (іх налічваецца 23) знаходзяцца на балансе спецыялізаванага камбіната камунальна-бытавога абслугоўвання. У іншых гарадах утрыманне могілак — задача, як правіла, мясцовых камунальных гаспадарак.

За парадак на сельскіх могілках адказваюць мясцовыя сельвыканкамы, і загадчыка тут няма ўвогуле. Паспрабуйце ахапіць пахаванні ўсіх 15—20 вёсак сельсавета. А яшчэ калі ў кожнага населенага пункта свае могілкі... Аднаму проста нерэальна з усім справіцца.

На могілках у Мінску, як правіла, заўжды ёсць кантралёр кантрольна-пропускнога пункта. Ён сочыць за бясплатным уваходам і платным уездам на машынах. Ноччу супрацоўнік абыходзіць тэрыторыю і зачыняе ўсе брамы на замок. Тым не менш на сямі дробных сталічных могілках, накшталт Дворышча, Пятроўшчыны, Сухарава, не заўжды можа быць супрацоўнік нават днём, не тое што ноччу.

Кантралёр абавязаны таксама прадухіляць крадзяжы. Калі ўзнікае падазрэнне, што машына выязджае з могілак перагружаная, яго задача — апавясціць міліцыю.

— Мы не маем права даглядаць аўто, аднак калі падазраём, што на машыне нешта вывозяць, спыняем і выклікаем міліцыю. З могілак і помнікі вывозяць, і пліты, і каляровы метал, — расказаў **Мікалай РАКЕВІЧ, дырэктар КУП «Спецыялізаваны камбінат камунальна-бытавога абслугоўвання»** (КБА). — Нядаўна злавілі аднаго такога. Вывозіў метал з Усходніх і Кальварыйскіх могілак. Розныя вазачкі, упрыгажэнні з помнікаў. Зладзеі шукаюць каштоўныя рэчы з дапамогай магніту. Ён не «прыстае» да каляровага металу.

На могілках у кожнага свой час для наведванняў. З 1 красавіка да 1 кастрычніка — з 9 раніцы да 9 вечара. З 1 кастрычніка па 31 сакавіка тут пераходзяць на зімовы час візітаў — з 9 раніцы да 7 вечара. Пры гэтым па законе на могілкі не маюць права не пусціць, у які б час ты ні прыйшоў. Вядома, мала хто памкнецца на магілу пасярод ночы, але здараецца і такое. Тады людзей пускаюць. Вось толькі на машыне заехаць ночу не дазволяць.

— Такі рэжым працы ўстанавілі, каб папярэдзіць крадзяжы. Хоць афіцыйна супрацоўнікі могілак не нясуць адказнасці за захаванасць надмагільных збудаванняў, — дадаў дырэктар.

Акрамя крадзяжоў, хоць і вельмі рэдка, але здараюцца на могілках і самавольныя пахаванні. Пры гэтым, як правіла, парушаюцца санітарныя нормы і нават межы суседніх участкаў. Пасля прыходзіцца з міліцыяй шукаць сваякоў чалавека, якому апошні прытулак арганізавалі такім чынам.

## Мільён кветак. Пластыкавых

Спецыялізаваныя арганізацыі ці тыя, каго мясцовыя ўлады прызначылі адказнымі за ўтрыманне могілак, павінны сачыць за парадкам на пагосце.

— Яны сочаць за чысцінёй месцаў пахавання, спраўнасцю работы будынкаў, водаправода і каналізацыі, калі яны ёсць на могілках, — кажа **Марына ТОЎСЦІК, начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства ЖКГ.** — Праезды, клумбы, газоны і іншыя месцы агульнага карыстання ачышчаюць ад смецця, снегу і лістоты, летам паліваюць, а ўзімку — пасыпаюць пяском. Акрамя таго, могілкі азеляняюць, фармуюць дрэвы і кусты, косяць траву.

У абавязках арганізацый таксама вываз смецця з кантэйнерных пляцовак, пілаванне сухіх дрэў, рамонт знешняй агароджы могілак. Усё гэта робіцца за кошт дзяржавы. Аднак калі сваяк памерлага папросіць знішчыць дрэва, якое, напрыклад, каранямі ўздымае магілу, гэтая паслуга ўжо будзе платнай.

Смецце пасля рамонту ці прыборкі на пагостах вывозяць адпаведныя службы. Старыя вянкі і кашы´ з магіл збіраюць асобна. Па інфармацыі цэнтра экалагічных рашэнняў, штогод на могілках з'яўляецца мільён пластыкавых кветак, на якія беларусы трацяць паўмільёна долараў. Пасля гэта пераўтвараецца ў 10 тон пластыка, які раскладаецца на звалках больш за 100 гадоў, паралельна забруджваючы ваду, зямлю і паветра. Кіраўніцтва КБА таксама раіць класці на магілу толькі жывыя кветкі і хадзіць на магілы хоць бы два разы на год: вясною на Радаўніцу і восенню на Дзяды.



З будаўнічым смеццем пасля рамонту месцаў пахавання крыху прасцей. Яго здаюць на ўтылізацыю, за што трэба плаціць грошы.

— Таму мы і бяром з людзей ці арганізацый плату за ўтылізацыю будаўнічых адходаў пасля работ на магіле, — растлумачыў дырэктар спецкамбіната. — Мы, напрыклад, адпрацаваны бетон вывозім і плацім за яго перапрацоўку ў шчэбень.

## На аднаго, двух ці чатырох

Родныя і сваякі памерлых павінны самі клапаціцца пра стан пагостаў і тэрыторый паміж участкамі пахаванняў.

— Сачыць за захаванасцю калумбарных ніш, пліт і надмагільных збудаванняў, своечасова рамантаваць і фарбаваць іх, а таксама мяняць разбураныя элементы павінны людзі, якія ўстанаўлівалі гэтыя помнікі, — падкрэсліла Марына Тоўсцік. — Яны таксама павінны клапаціцца пра чысціню на ўчастку. Даглядаць газон, кветнік ці жывую агароджу на магіле. За плату можна таксама заключыць дагавор на выкананне ўсіх гэтых работ спецыялізаванымі арганізацыямі.

Дарэчы, знешні выгляд помнікаў і агароджы, а таксама памеры самога пагоста па сучасных правілах павінны адпавядаць стандартам. Участак для аднаго пахавання — гэта плошча 1,4 х 2,3 метра, для двух — 2 х 2,3, для трох — 3 х 2,3, для чатырох — 4 х 2,3. Вышыня помніка не больш як 1,8 метра і агароджа не вышэй за 40 сантыметраў.

— Старыя помнікі дазвалялася рабіць іншых памераў, і мы не прымушаем сваякоў зносіць іх і рабіць па новых правілах. Іншая справа, калі хочуць паставіць новую надмагільную пліту ці агароджу. Іх прыйдзецца выканаць у адпаведнасці з новымі стандартамі, — падкрэсліў дырэктар КБА. — Пра ўсе планаваныя будаўнічыя работы на пагосце чалавек абавязаны паведаміць загадчыку могілак. Той, у сваю чаргу, павінен выдаць памятку, каб падчас рамонту на магіле не было штосьці парушана. Напрыклад, пра афарбоўку агароджы ці рамонт помніка паведамляць неабходна, а саджаць кветкі і прыбіраць лісце можна без папярэджанняў.

## Звяртайце ўвагу на абвесткі

Каб быць упэўненым, што зможаш адшукаць магілу сваяка, трэба не толькі прыходзіць на яе з кветкамі, але і рэагаваць на абвесткі, якія пакідаюць мясцовыя служачыя. Кожныя два гады яны праводзяць інвентарызацыю месцаў пахавання і вешаюць на ўчастках абвесткі з просьбай навесці парадак: адрамантаваць памятнік ці пліту, пафарбаваць агароджу.

> «Калі сваяк памерлага папросіць знішчыць дрэва, якое, напрыклад, каранямі ўздымае магілу, гэтая паслуга ўжо будзе платнай.

Па выніках сёлетняй праверкі толькі ў Мінску больш як 27 тысяч пахаванняў неабходна прыбраць. Перш за ўсё гэта датычыцца напаўразбураных, а то і ўвогуле ляжачых помнікаў, іржавых агароджаў, безыменных пахаванняў.

— Калі праз два гады парадак так і не навялі, мы маем права за дзяржаўны кошт ліквідаваць помнік і агароджу і замест іх паставіць спецыяльны знак, так званы падгалоўнік, — падзяліўся Мікалай Ракевіч. — Бывае, што ў памерлага ўжо і не засталося ніякіх сваякоў і няма каму глядзець за магілай. А здараецца, што прыходзілі потым, кветкі прыносілі. Некаторыя спачатку злаваліся, што замест магілы з участкам знаходзілі знак. Пасля дзякавалі, што мы прыбралі.

Каб пазбавіцца ад старых закінутых магіл і ўпарадкаваць участкі, тры гады таму супрацоўнікі спецкамбіната прапанавалі ўнесці змены ў закон «Аб пахаванні і пахавальнай справе».

— Мы меркавалі так. Калі праз два гады сваякі не знаходзяцца, то можна правадзіць эксгумацыю астанкаў, крэміраваць іх і хаваць на дальніх канцах могілак у агульную магілу. А месцы, якія такім чынам вызваліліся, — аддаваць людзям, якія пры гэтым павінны пакрыць нашы затраты. Такі або падобны парадак існуе ў многіх краінах. Там могілкамі карыстаюцца стагоддзямі. А ў нас — усяго пару дзесяцігоддзяў. Гэта цалкам мэтазгодна, бо хутка нам не будзе дзе хаваць, — упэўнены дырэктар КБА. — Царква тады выступіла супраць, але сёлета мы ізноў будзем уносіць свае прапановы ў наступны варыянт карэкцыроўкі закона. Сучаснае заканадаўства стала больш строга ставіцца да месцаў пахавання. Раней многія старыя могілкі проста руйнаваліся. Цяпер так рабіць нельга. І вось уявіце, што праз некалькі дзесяцігоддзяў Мінск можа апынуцца ў кальцы могілак. Пры гэтым новых земель для стварэння пагостаў вакол сталіцы няшмат...

**Ірына СІДАРОК.**

### ЯК У ЕЎРОПЕ

Каля аэрадрома Ліпкі пад Мінскам у Магілёўскім напрамку сёлета пачнецца будаўніцтва новых могілак на 100 гектараў. Пад гэтыя мэты перададзены землі былога палігона. Плануецца, яго магчымасцяў хопіць гадоў на 20. Па памерах яны амаль такія ж, як і Паўночныя, дзе пахавана каля 100 тысяч чалавек.

Па праекце на новых могілках будуць арганізаваны газонныя ўчасткі, калумбарныя сценкі, двух-, чатырох- і шасцімесныя ўчасткі для пахаванняў, водаправод. Зробяць пад'ездныя дарогі да комплексу і сцежкі ўнутры саміх могілак. Пабудуюць адміністрацыйна-бытавы корпус, правядуць святло, усталююць агароджу. Як мяркуюць спецыялісты, пагосты не будуць адрозніваца ад аналагічных аб'ектаў у Еўропе.

Могілкі стануць будаваць паэтапна. Спачатку зробяць будынак адміністрацыі, агароджу і некалькі ўчасткаў. Пасля дабудуюць усё неабходнае. Узводзіць царкву на тэрыторыі не плануецца.

## Зямлі на ўсіх не хопіць

**Два месцы на могілках выдзяляюцца бясплатна. Калі патрэбна плошча на большую колькасць людзей побач, прыйдзецца плаціць. У кожнай мясцовасці — свая цана. Дарэчы, пасля 20 гадоў ва ўжо існуючыя магілы можна пакласці яшчэ адну труну (пры наяўнасці доказу) з блізкім сваяком. А праз наступныя 20 — яшчэ аднаго. Астатнія пахаванні на ўчастку ўжо робяцца праз урны з прахам, якія можна паставіць у калумбарныя нішы ці сценкі ад аднаго да шасці месцаў.**

«Сэканоміць месца» ўдаецца за кошт крэмацыі, праз якую штомесяц праходзіць палова памерлых мінчан. Непадалёк ад Мінска працягваюць дзейнічаць толькі Заходнія могілкі, аднак праз два-тры гады іх рэсурс будзе вычарпаны.

— Людзі не хочуць хаваць сваякоў далёка. Ім зручней побач, у сталіцы. Тады мы будуем калумбарныя сценкі і прапануем ставіць у іх урны з прахам сваякоў. У Германіі крэміруюць 90 % памерлых, у Прыбалтыцы — ледзьве не 100 %, бо не хапае зямлі, — заўважае **дырэктар спецыялізаванага камбіната камунальна-бытавога абслугоўвання Мікалай РАКЕВІЧ.**

На яго думку, лепш хаваць у урнах таксама і таму, што пры пахаванні яшчэ аднаго чалавека ва ўжо існуючую магілу ўзнікаюць складанасці з іх абазначэннем.

— Ці то помнік мяняць, ці проста выбіць на існуючым другое імя... І побач два помнікі не паставіш. Значна лепш захаваць прах у калумбарнай нішы, дзе і партрэт, і імя, і паставіць яе можна ў любым месцы ўчастка. У Польшчы, напрыклад, 30 крэматорыяў, у кожным ваяводстве свой. У Чэхіі з амаль такой жа колькасцю насельніцтва, як і ў Беларусі, — 36 крэматорыяў. А ў нас — адзін. Нашы людзі таксама калі-небудзь усвядомяць неабходнасць крэмацыі. Яшчэ два гады таму мы крэміравалі каля 25 % памерлых, цяпер ужо палову. Гадоў праз 20—30, думаю, дакладна будзем крэміраваць 90 % памерлых.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

# Юлія ОГНЕВА: «Я не проста прыгожая вядучая ў чырвоным касцюме»



**У мінулыя выхадныя на СТБ адбылася прэм'ера — у нядзелю ў эфіры з'явілася інфармацыйна-аналітычная праграма «Тыдзень», якая расказвае пра падзеі сямі апошніх дзён. Новая студыя, новыя дэкарацыі, новая графіка, а галоўнае — новая вядучая. Як абяцаюць на тэлеканале, гэта будзе аўтарскі погляд на тое, што адбылося ў краіне і свеце, а таксама эксклюзіўныя інтэрв'ю і рэпартажы, ключавыя ньюсмейкеры і экспертныя меркаванні. Рэпарцёрскі фармат перадачы з вострымі фармулёўкамі яркай вядучай Юліі ОГНЕВАЙ ужо паспелі ацаніць гледачы.**

***— Юля, прабачце за гэта параўнанне, але вы вельмі падобная на расійскую вядучую «Вынікаў тыдня з Ірадай Зейналавай» на НТБ...***

— Яшчэ мяне параўноўваюць з Марыяй Кісялёвай і нават Ганнай Чапман... Мне здаецца, якім бы ты ні быў у кадры, пазбегнуць параўнання з кімсьці іншым цяжка. Тыя, хто мяне ведае даўно — з універсітэта, па ранейшай рабоце, а навінамі я займаюся ўжо амаль 15 гадоў, пацвердзяць, што гэта мой не экранны, не надуманы вобраз. Я такая насамрэч. Праграма максімальна набліжаная да таго, каб назваць яе аўтарскай — мой напор, мае тэксты.

***— На тэлебачанне вы прыйшлі крыху больш за тыдзень таму...***

— Так. Пасля ўніверсітэта я працавала ў медыя-холдынгу «Мінск-Навіны» — пераважна на «Радыё-Мінск», але пісала і для газеты «Мінскі кур'ер», і для агенцтва навін. Была спачатку карэспандэнтам, пасля рэдактарам, узначальвала дырэкцыю ранішніх праграм, потым кіравала аддзелам навін. Затым быў перыяд, калі працавала вядучай навін на радыёстанцыях «Мелодыі века» і «Бі-Эй». А апошнія чатыры гады была аглядальнікам у інфармацыйным агенцтве БелТА. Зрэшты, я асэнсавана ішла працаваць журналістам: хацелася пабыць не кіраўніком, а выканаўцам. У БелТА, дарэчы, як нідзе, разумееш, што ў журналіста няма права на памылку. Твае навіны — першакрыніца для многіх выданняў. Калі памыліўся ты, памыліліся ўсе астатнія. І гэта работа дала грунтоўны падмурак для сённяшняга майго праекта. На тэлебачанне мяне запрасілі ў якасці, як бы моцна гэта ні гучала, вядомага журналіста. У мяне ёсць «Залатая Літара» ў намінацыі «Найлепшы рэпарцёр», якую я атрымала ў 2016 годзе. Гэта быў своеасаблівы вынік на тым этапе кар'еры, і ён даў мне ўпэўненасць, што ў гэтай галіне я ўмею калі не ўсё, то многае. Праграма «Тыдзень» задумвалася як аўтарская, з журналістам у якасці вядучай, і хоць так ці інакш мяне называюць вядучай, я пазіцыяную сябе найперш як журналіста. Я сама буду рабіць сюжэты, разбірацца ў тэме, рыхтаваць пытанні і інтэрв'юіраваць спікераў. Мне важна захаваць журналісцкі складнік у маёй рабоце.

***— Відавочна, што прыйсці на тэлебачанне і пачаць працаваць у кадры з нуля вельмі няпроста...***

— Калі я працавала на радыё, займалася тэхнікай мовы. Мне дапамагаў наш знакаміты майстар Уладзімір Ільіч Курган. Акрамя гэтага, у мяне ёсць пэўныя тэатральныя навыкі. «Драмгурток, гурток па фота, а яшчэ мне пець ахвота» — гэта пра мяне ў школьны час. Дзевяць гадоў іграла на цымбалах, фартэпіяна, наведвала тэатральную студыю — усё гэта цяпер дапамагае. Водгукі, дарэчы, пасля першай праграмы былі станоўчыя. Але, зразумела, што ў дасканаласці няма мяжы, і я ўсведамляю, што давядзецца над сабой працаваць.

***— Спадабаліся сабе ў першай праграме?***

— Я дастаткова крытычны чалавек, і спадабацца мне няпроста, тым больш самой сабе. Але на мой погляд, усё выглядала як мае быць. Ведаю, што сябры і знаёмыя ў любым выпадку скажуць «Ваў, ты крутая!», таму не вядуся на захапляльныя водгукі. Ёсць блізкія сяброўкі, ад якіх я заўсёды чакаю праўду. І мне здаецца, яны мне яе сказалі: у цэлым нядрэнна, нягледзячы на тое, што ёсць няроўнасці. І калі ўкласці шмат працы, намаганняў, сіл, то гэта будзе добрая перадача.

***— У адным з сюжэтаў вам не толькі давялося наведаць кароўнік, але і першы раз у жыцці падаіць карову. Трэба прызнаць, не кожная вядучая на такое пагодзіцца...***

— Нельга сказаць, што раней я не бачыла кароў. Хоць я нарадзілася ў Мінску і была дастаткова гарадскім, рафінаваным дзіцем, у маім дзяцінстве была вёска ў самым класічным разуменні: з каровамі, гусямі, курамі, з сырадоем. Лета я праводзіла там, пасвіла статак з дзядулем, праўда, сама кароў не даіла... Так, у кароўніку быў своеасаблівы журналісцкі экстрым, але такая мая задача — каб падобныя сюжэты меліся ў кожнай праграме.

***— Асабіста вам што больш цікава: такі рэпартажны экстрым ці інтэрв'ю, скажам, у парламенце?***

— Інтэрв'ю ў парламенце ці з міністрамі — гэта звыклая праца. А вось паездкі ў кароўнік — новае для мяне. І я ўдзячная, што нарадзілася такая ідэя, калі частка праграмы будзе звязана з жывымі паездкамі на месца падзей.

***— Раскрыеце планы, чым у найбліжэйшы час збіраецеся здзівіць гледача?***

— Магчыма, на гэтым тыдні будзе нешта спартыўнае. Абяцаю, што ў кожнай праграме з'явяцца сюжэты, дзе я стану часткай таго, што адбываецца ў той ці іншай сферы нашага жыцця.

***— Такі бойкі і нават крыху агрэсіўны стыль падачы навін — патрабаванне сённяшняга часу?***

— Я не магу сказаць, што ўся журналістыка павінна быць такой. Мяркую, у кожнага тэлеканала мусяць быць пэўныя праграмы, а ў іх — свой пазнавальны твар. Спадзяюся, праграма «Тыдзень» у маім выкананні запомніцца гледачам. Яна можа падабацца, можа не падабацца, галоўнае, каб не пакінула людзей раўнадушнымі. Так ці інакш, камусьці стыль падачы здаецца рэзкаватым, навязлівым, але зараз такі свет: ён дынамічны, жорсткі, імклівa мяняецца. Не пра ўсе падзеі можна казаць з усмешкай на твары.

***— У праграме не толькі новы фармат і новая вядучая, але і цікавая аператарская работа...***

— Так, мы стараемся ўзяць усё самае лепшае і сучаснае, што ёсць на сёння. Гэта і здымкі з квадракоптара, і камера, якой можна здымаць падчас руху. Усё гэта будзе максімальна задзейнічана. Мы за сучасную карцінку, за сучасную вядучую, за сучасную падачу навін. Аператарскую работу будзем максімальна арганізоўваць такім чынам, каб у гледача ствараўся эфект прысутнасці.

***— У стартавай праграме мелася сур'ёзная заяўка на інтэрв'ю з кампетэнтнымі спікерамі, сярод якіх старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч, старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка, міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч...***

— Так, у кожнай нашай праграме будзе вялікае інтэрв'ю. Каму, як ні міністрам, іншым vip-персонам, расказваць пра тое, што адбываецца ў галіне, за якую яны адказныя. Праграма выніковая, таму і замежных навін мы не пазбегнем. Але мы пераважна арыентаваныя на тое, каб расказваць, што адбываецца ў нашай краіне. А паколькі ў нас сталічнае тэлебачанне, то ў кожнай праграме будзе сюжэт пра тое, што хвалюе мінчан. За маімі плячыма, за маім чырвоным касцюмам вялікая каманда прафесіяналаў, якія дапамагаюць зрабіць усё гэта якасна і маштабна.

> «Калі ішла на кастынг ад вуліцы Кірава ўздоўж набярэжнай Свіслачы на Камуністычную, рабіла два крокі наперад і адзін назад...»

***— Касцюм, дарэчы, заўсёды будзе чырвоны?***

— Не. А вось чырвоная памада будзе заўсёды. Такі мой вобраз, і ён з'явіўся ў працэсе падрыхтоўкі праграмы. Паглядзеўшы на мяне ў кадры, вырашылі рызыкнуць і зрабіць вобраз яркім. Прыйшлося высвятліць, ці зможа мая знешнасць вытрымаць выпрабаванне чырвоным касцюмам і чырвонай памадай перад камерай. Усё атрымалася, як бачыце. Таксама колер валасоў зрабілі цямнейшы. І калі Ірада Зейналава, з якой вы мяне параўноўваеце, заўсёды ў касцюме аднаго колеру — чорнага, у мяне ў розных праграмах будуць розныя ўборы: і штаны, і спадніцы.

Вяртаючыся да каманды нашай перадачы, зазначу, што працаваць у БелТА мне было проста, бо канчатковы прадукт залежаў толькі ад цябе. На тэлебачанні складаней, тут не ўсё залежыць ад мяне. Але разумееш, што заўсёды ёсць той, хто можа цябе падтрымаць.

***— І ў той жа час, той, хто можа зрабіць лепш за вас...***

— Я не прэтэндую, каб мой сюжэт у праграме быў найлепшым. Я — візітоўка гэтай праграмы. А за мной журналісты Алена Сырова, Тацяна Рэвізорэ, Яўген Горын, рэжысёры Станіслаў і Крысціна Яркіны-Маскалёвы, Ніна Ліпская, Антон Ганчар, відэаінжынер Дзяніс Зубовіч, аператары, грымёры, стылісты. Вялікі дзякуй намесніку дырэктара дырэкцыі спецпраектаў Вользе Сахаравай. І, канешне, генеральнаму дырэктару, Ігару Луцкаму, за тое, што паверыў у мяне. Увогуле, вялікая каманда робіць гэту праграму. Так здарылася, што мне пашчасціла быць вядучай і мой твар, мой тэмперамент, мае якасці ўдала спляліся ў гэты экранны вобраз.

***— Калі ішлі на тэлебачанне, не было боязі, што вашу працу будуць разглядаць пад мікраскопам, асабліва калегі, якія шмат гадоў працуюць на тэлебачанні, і таксама хацелі б у кадр, але ўзялі вас?***

— Зразумела, была такая боязь. Калі ішла на кастынг ад вуліцы Кірава ўздоўж набярэжнай Свіслачы на Камуністычную, рабіла два крокі наперад і адзін назад... Я раней ніколі не ўяўляла сябе ў кадры, у мяне не было тэлевізійнага вопыту, экраннага вобразу. І мне нічога не заставалася, як быць самой сабой. На першым кастынгу я павінна была прачытаць чужы тэкст, пасля быў другі кастынг, для якога я напісала свой. Тады і прынялі рашэнне, што я буду працаваць над праграмай.

***— Усведамляеце, што ўдзельнікі вядучых такіх праграм здзіўлены: за тыдзень паспяваюць пабываць у шматлікіх месцах і зняць мноства сюжэтаў. Наколькі гэта складана і як з такім графікам знаходзіць час для сям'і?***

— Я прыйшла ў праграму не самазаспакоіцца і спачываць на лаўрах. Я не проста прыгожая вядучая ў чырвоным касцюме. І з першага дня падрыхтоўкі праграмы я працавала дастаткова напружана. Не сакрэт, што мне яшчэ трэба шмат прайсці ў спасцяжэнні тонкасцяў тэлевізійнай кухні. Але як жартуюць мае знаёмыя, да мяне можна падключаць правады, і я буду асвятляць горад: маёй прыроднай энергіі хапае на ўсё.

Мая сям'я — гэта муж і сын, якому дзевяць гадоў. На шчасце, у нас ёсць мае бацькі, якія вельмі дапамагаюць. Спадзяюся, што ўдасца графік арганізаваць такім чынам, каб паспяваць усё. Сям'я для мяне ўсё роўна на першым месцы. Тым больш што час адпачыць ёсць: наступны дзень пасля эфіру, панядзелак — дастаткова вольны, калі можна не спяшаючыся пераглядзець навіны, спланаваць наступную перадачу, паслухаць заўвагі і прапановы калег.

***— Як, дарэчы, калегі ацанілі першую праграму?***

— Адзначылі, што раней на СТБ нічога такога не было. А на беларускім тэлебачанні ўвогуле выніковых аналітычных праграм з жанчынамі-вядучымі не выходзіла ніколі. Таму гэта ў любым выпадку цікава. Пахвалілі, што ў нас было шмат эксклюзіваў. Таму мне здаецца, калі працягваць у тым жа тэмпе, мы заваюем новага гледача і пашырым сваю аўдыторыю.

**Алена КРАВЕЦ.**




## Аўторак, 17 красавіка

### Беларусь 1

**6.55 Меладрама «Дэдзуля». (12+).**
**8.50** Слова мітрапаліта Паўла на Радаўніцу.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10, 12.10, 15.10 Серыял «Бывай, каханая». (16+).**
**17.20 Меладрама «Атэль шчаслівых сэрцаў». (12+).**
**21.00** «Панарама».
**21.45 Меладрама «Пасля цябе» (16+).**

### Беларусь 2

**7.00** М/с «Фіксікі» (0+).
**7.35 Фільм для дзяцей «Пярсцёнак княгіні Ганны» (6+).**
**9.00, 20.40** «Тэлебарометр».
**9.05** «Свет навыварат». (16+).
**10.15 Маст. фільм «Джобс: імперыя спакусы» (12+).**



**12.20, 22.05** «Арол і рэшка. Юбілейны». (16+).
**13.15** «Паненка-сялянка». (16+).
**14.20** «Бітва салонаў». (16+).
**15.20, 23.05 Серыял «Найлепшы тыдзень майго жыцця». (16+).**
**16.10** «Спатканне з будучыняй». (16+).
**17.10** «Багіня шопінгу». (16+).
**18.10 Драма «Баявы конь» (16+).**
**20.45** «Абмен жонкамі». (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

### Беларусь 3

**7.30, 12.15** «Беларуская кухня». «Сялёдка з карпа.
**8.00, 12.00, 19.55** Навіны культуры.
**8.15, 12.10, 20.10** Гэты дзень.
**8.20** «Размовы пра духоўнае». Радаўніца.
**8.30 «Трактарысты». Маст. фільм (12+).**
**9.55** «Я хачу гэта ўбачыць!» Налібокі (6+).
**10.20 «Следапыт». Прыгоды (12+).**
**12.45** «Беларусь, як песня». Галіна Галенда.
**13.10** «Песні мінулага стагоддзя». Канцэрт памяці Уладзіміра Мулявіна.
**14.05** «Пясняр. Сэрцам і думамі». Дак. фільм (12+).
**14.45** «Тэатр у дэталях». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі «Сівая легенда».
**15.10** Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў. Опера Д. Смольскага «Сівая легенда».
**16.45** М/ф (0+).
**17.20 «Зніклая экспедыцыя». Прыгоды (12+).**
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.20** «Поспех». Дак. фільм (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Экіпаж». Драма (12+).**
**23.25** «Адступнік». Дак. фільм.
**23.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнай артысткі СССР Лідзіі Ржэцкай.

### Беларусь 5

**6.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вест Хэм» — «Сток Сіці».
**8.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**9.45** Хакей. КХЛ. Фінал. 2-і матч. «Ак Барс» (Казань) — ЦСКА (Масква).
**11.40** Час футбола.
**12.20** Кікнадзэ. Меркаванне.
**12.50** Хакей. Еўравыклік. Швейцарыя — Беларусь.
**14.45** Гандбол. SEHA-Газпром Ліга. Фінал 4-х. Матч за 3-е месца.
**16.25** Гандбол. SEHA-Газпром Ліга. Фінал 4-х. Фінал.
**18.30** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**20.35** Легенды сусветнага спорту.
**21.05** Спорт-кадр.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Брайтан» — «Тотэнхэм». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10 Маст. фільм «Шчыра Ваш...» (12+).**
**9.10 Меладрама «Жорсткі раманс» (12+).**
**11.55, 23.25 Камедыя «Жывіце ў радасці» (16+).**
**13.25 Драма «Нябесны суд» (12+).**
**15.20, 16.20, 19.05 Серыял «Часцінка сусвету» (16+).**
**18.20** «Удача ў прыдачу! з «Еўраопт».
**21.10 Маст. фільм «Я застаюся» (16+).**

### СТБ

**6.35** Дакументальны спецпраект (16+).
**8.10 «Сляды апосталаў». Серыял (12+).**
**11.40 Камедыя «Эйр Амерыка» (16+).**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40 Камедыя «Высокі бландзін у чорным чаравіку» (12+).**
**15.20** «Вялікі горад».
**15.55, 16.40 Камедыя «Белыя росы» (12+).**
**17.40 Маст. фільм «Белыя росы. Вяртанне» (12+).**
**19.55** «СТБ-спорт».
**20.00 Маст. фільм «Гульня ў імітацыю» (12+).**
**21.50** «Аўтапанарама» (12+).
**22.10** Эрык Клэптан: фестываль гітарнай музыкі «Скрыжаванні» (12+).

### МІР

**6.00 Серыял «АСА» (16+).**
**7.50, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Тульскі Токараў» (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00, 4.35** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.10, 2.40 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Серыял «Пятніцкі» (16+).**
**22.10, 0.10 Маст. фільм «Лекцыі для хатніх гаспадынь» (12+).**
**0.00** Навіны (бягучы радок) у поўнач.
**0.25 Маст. фільм «Арфа для каханай» (12+).**
**2.10** «Іншы свет» (16+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 20.40 Серыял «Бярозка». (12+).**
**13.30** «Пакой смеху». (16+).
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.30 Серыял «Каменская». (16+).**
**0.05** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10 Серыял «Час Волкава». (16+).**
**8.10 Серыял «Мухтар. Новы след». (16+).**
**9.00 Серыял «Сужэнцы». (16+).**
**10.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05, 16.35 Серыял «Брацені». (16+).**
**17.25** «ДНК». (16+).
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч». (16+).**
**21.15 Серыял «Пяць хвілін цішыні». (12+).**
**23.00** «Вынікі дня».
**23.30 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**
**0.00** «Гісторыя міліцыі ў асобах». (12+).

### 8 канал

**7.00, 16.00, 19.35, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.30, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.15 Серыял «Макс» (16+).**
**9.00, 19.40 Серыял «Я пачую цябе» (16+).**
**10.10** «Майстар-клас».
**10.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**11.00 Драма «Колер сакуры» (18+).**
**13.00 Серыял «Каханне цудоўнае» (16+).**
**14.35 Баявік «Пасажыр 57» (16+).**
**16.05** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.10** «Мульт-парад».
**16.50** «Сад і агарод».
**17.20 Серыял «Анёлы» (16+).**
**18.45 Серыял «Абаронца» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15** «Пра спорт».
**21.30 Камедыя «Нагледзеўшыся дэтэктываў» (16+).**

# Шныпарыць не блізкі свет

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» віктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**во́сень** — памяшканне каля тока, у якім сушаць снапы;
**лама́нка** — пераломнае ружжо;
**вэ́ндзіць** — правяльваць у дыме;
**шныпарыць** — бегаць, рухацца сюды-туды;
**стрэ́мка** — тонкая трэска, якая залезла пад скуру;
**ягамо́сць (устар., адно са значэнняў)** — форма звароту да каго-небудзь; пан.

**Як сабак нярэзаных** — вельмі многа (у дачыненні да людзей або іншых жывых істот). Беларусы яшчэ скажуць: *да гібелі, да ліха, адбою няма*. Руская: *по самую завязку, тьма тьмущая*.

**Не блізкі свет** — вельмі далёка знаходзіцца. Беларускія сінонімы: *за светам, за дзясятай гарой*. Рускія адпаведнікі: *за тридевять земель, у черта на куличках*.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер» (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**8.15, 19.00, 23.40** «Уральскія пельмені». (16+).
**9.00. 3.00** М/ф «Марын і яго сябры». (0+)
**9.30, 3.25** М/ф «Скубі Ду». (6+)
**10.00, 3.50** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**10.20, 2.10** «Ералаш» (6+).
**10.40** Анімацыйны фільм «Варушы ластамі!» (0+).
**12.00** Фантастыка «Трансформеры». (12+).
**14.50** Фантастыка «Трансформеры: помста паўшых». (12+)
**17.45** Фантастыка «Трансформеры-3: цёмны бок Месяца». (12+).
**20.40** Фантастыка «Трансформеры: эпоха вынішчэння». (12+).
**23.50** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**1.20** «Кіно ў дэталях» (16+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.15** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Элізабэт Тэйлар.
**7.05** «Пешшу...» Масква забароненая.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.05** «Апошні візіт». Маст. фільм.
**9.15** «Рускі стыль». «Багема».
**9.40, 19.45** Галоўная роля.
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10** ХХ стагоддзе. «Мы пасябравалі ў Маскве. Фестываль моладзі і студэнтаў». Дак. фільм.
**12.15, 15.45** Сусветныя скарбы.
**12.30** «Геній».
**13.00** «Саці. Нясумная класіка...»
**13.40, 20.45** «Мільённы год». Дак. фільм.
**14.30** «Містыка кахання». Васіль Жукоўскі і Марыя Пратасава».
**15.10** Манрэальскі сімфанічны аркестр. Р. Шуман. Сімфонія № 1 «Вясновая».
**16.00** «Эрмітаж».
**16.30** «2 Вернік 2».
**17.20** «Вялікі князь Мікалай Мікалаевіч Малодшы. Рады даказаць сваю любоў да Расіі». Дак. фільм.
**18.45** «Астравы». Яўген Урбанскі.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.35** Штучны адбор.
**22.20** «Медычы. Уладары Фларэнцыі». Серыял (18+).
**23.35** Нацыянальная тэатральная прэмія «Залатая маска» — 2018. Цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў.
**2.00** — Прафілактыка.

### Настальгія

**6.00** «Вясёлыя рабяты». «Моладзь і музыка». 1986 год (12+).
**7.20** «Вакол смеху». 1979 год (12+).
**8.50, 11.15, 14.40, 15.40, 17.00, 19.45, 20.40, 21.40, 23.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00** Маст. фільм «Звычайная гісторыя» (16+).
**11.25** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год (16+).
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Дип Перпл». 2005 год (18+).
**13.15** «Мы Вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресение». 1994 год (16+).
**14.25** «Перапынак». Маст. фільм (12+).
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Біржавы рух». 2006 год (12+).
**19.10** «Гутарка з Прэзідэнтам СССР». 1991 год (12+).
**20.05** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Па абодва бакі закона». 1992 год (16+).
**0.00** Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).
**1.35** Фільм-канцэрт «Вас запрашае Сафія Ратару». 1985 год (12+).
**2.50** М/ф «Пластылінавая варона» (6+).
**3.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**4.00** Маст. фільм «Дзённы цягнік» (16+).
**5.35** «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1995 год (12+).

### EuroSport 1

**3.00, 6.30, 13.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**4.00, 9.30, 14.00, 21.30, 0.30** Веласпорт. «Тур Альп».
**5.00, 18.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**8.00** Веласпорт (трэк). Шэсцьдзён Мальёркі.
**10.30** Веласпорт. Гонка Amstel Gold.
**11.30** Алімпійскія гульні. «Гонка тэхналогій».
**12.30** Алімпійскія гульні. «Анатомія спорту».
**16.30, 22.00, 1.30** Веласпорт. «Тур Харватыі».
**18.00** Футбол. «ФІФА».
**19.00** Конны спорт. Кубак свету.
**21.00** «Найлепшае з коннага спорту».
**23.00, 2.30** Аўтагонкі. Формула Е.
**0.00** «Гісторыі чэмпіёнаў».

### Кінакамедыя

**1.35** Чаго хочуць жанчыны? (16+).
**4.05** «Шоу Камедыянты». (16+).
**4.45** Герой месяца. (16+).
**6.35** Вулкан страсцей. (12+).
**8.20** Таксі-3. (16+).
**9.55** Таксі-4. (16+).
**11.35** Джулі і Джулія: гатуем шчасце па рэцэпце. (16+).
**14.00** 3 13 у 30. (12+).
**15.45** Мамчын сынок. (12+).
**17.40** Працнуўшыся ў Рына. (16+).
**19.30** Мноства. (16+).
**21.40** Прыкінься маім мужам. (16+).
**23.35** Таўстун на рынгу. (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.00** «Доктар І...» (16+).
**8.30, 19.00, 2.05** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.15, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.55 17.20** «Варажбітка» (12+).
**13.30, 16.20** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**14.25** «Простыя складанасці» (12+).
**15.30** «Натуральны адбор» (12+).
**20.55** «Паненка і хуліган». Серыял (12+).
**21.55, 5.15** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**22.50** «Гісторыі выратавання» (16+).
**23.25** «Грань». Серыял (16+).
**0.10** «Скура, у якой я жыву». Трылер (16+).

### ТБ1000

**6.10, 18.00** Хуткі і мёртвы (16+).
**8.25** Кірмаш ганарыстасці (12+).
**11.15** Вёска праклятых (16+).
**13.15** Усмешка Моны Лізы (12+).
**15.40** Сківіцы-2 (16+).
**20.10** Сезон палявання-3 (12+).
**21.40** Дывергент-3. За сцяной (16+).
**0.00** Белы бог (18+).
**2.15** Воўк (16+).
**4.20** Аферысты Дзік і Джэйн (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Поп (16+).
**8.50** Памяць восені (16+).
**10.50** Снеданне ў таты (12+).
**12.35** Зорка чароўнага шчасця. 2-я серыя (16+).
**14.20** Брат (16+).
**16.20, 4.20** Дазвольце цябе пацалаваць... Бацька нявесты (16+).
**18.20** Галасы вялікай краіны (6+).
**20.20** Зацьменне (12+).
**21.55** Тарас Бульба (16+).
**0.30** 22 хвіліны (16+).
**2.10** Пецярбург. Толькі па каханні (18+).

### National Geographic

**6.00, 14.50** Найбуйнейшы ў свеце рамонт. (12+).
**6.50** Суперзбудаванні. (12+).
**7.40, 13.20** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.25, 11.40, 16.25, 20.25, 1.05, 4.20** Аўта-SOS. (12+).
**9.15** Прывіды Чорнага мора. (12+).
**10.05** Найцяжэйшы ў свеце рамонт. (12+).
**10.55** Золата Юкана. (12+).
**12.30** Прарыў. (12+).
**14.05** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**15.40, 19.35, 0.15, 2.40** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**18.45, 1.50** Тайныя гісторыі НЛА. (12+).
**22.45** Героі нябеснай вайны. (16+).
**23.30** Дзіўная Другая сусветная. (16+).
**5.10** Цуды інжынерыі. (12+).

### Discovery

**8.00, 17.05, 22.00, 4.40** Махінатары.
**8.50, 15.15** Як гэта ўстроена?
**9.45, 16.10, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады.
**10.40** Аўтападполле.
**13.25, 19.00, 5.30** Хуткія і гучныя.
**14.20** Разбуральнікі легенд.
**18.00** Круты віраж.
**20.00, 1.00, 2.55** Залатая ліхаманка.
**21.00, 6.20** Зроблена з другаснай сыравіны.
**0.00** Відэапатруль.
**2.00** Салдаты няўдачы.
**7.10** Выжыць любой цаной.

## На хвалі

# ХТО НАЙЛЕПШЫ ДРАМАТУРГ?

**Канал «Культура» Беларускага радыё сумесна з Цэнтрам беларускай драматургіі абвясцілі конкурс сучаснай п'есы «Беларускі радыётэатр у ХХІ стагоддзі». Удзел у творчым спаборніцтве могуць узяць як пачаткоўцы, так і прафесійныя аўтары ва ўзросце ад 16 гадоў.**

Для работы драматургам прапануюць некалькі тэм на выбар: «Моладзь і сучасныя каштоўнасці», «Дыялог культур у сучасным свеце» і «Моладзь і вечныя каштоўнасці: сучасны погляд».

«Удзельнікам неабходна ўлічваць спецыфіку радыёвяшчання, таму апісанні і дзеі п'есы мусяць быць зразумелыя для ўспрыняцця на слых», — дае падказку ўдзельнікам намеснік дырэктара канала «Культура» Уладзімір Трапянок.

П'есы на беларускай і рускай мовах можна дасылаць да 15 ліпеня бягучага года на адрас 220029, г. Мінск, вул. Чырвоная, 4 і на электронную пошту kulturakonkurs@radio.tvr.by з паметкай «Конкурс сучасная радыёп'есы».

Вынікі плануецца падвесці ўжо да канца ліпеня, а твор-пераможца, выбраны пры ўдзеле прафесіяналаў з галіны драматургіі, тэатра і радыёвяшчання, прагучыць у форме радыёспектакля ў эфіры канала «Культура».

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Эгаізм добры ў меру, інакш могуць узнікнуць пэўныя цяжкасці са сваякамі і сябрамі. Пастарайцеся сачыць за сваімі словамі і спачатку абдумаць, а потым штосьці казаць. Перапады настрою пагражаюць зрабіць вас не самым прыемным у зносінах чалавекам. У сярэдзіне тыдня аб'ём працы можа павялічыцца, надыходзіць гарачая пара. Вам могуць прапанаваць навучанне ў новай сферы дзейнасці, не адмаўляйцеся.

**СКАРПІЁН.** Для вас можа наступіць проста казачны тыдзень. Кар'ера і сведкае жыццё будуць удалымі, як ніколі. Скінеце з плячэй цяжар непатрэбных абавязацельстваў. Вашы дасягненні стануць прыкметныя навакольным. Толькі дакладна вызначце, чаго вы хочаце дасягнуць у найбліжэйшы час, і настойліва прасоўвайцеся да мэты, нягледзячы на цяжкасці. У пятніцу пажадана не планаваць важных спраў, вызваліцеся крыху раней. У суботу адпачніце ў камфортных умовах. Дзеці парадуюць сваімі поспехамі.

**СТРАЛЕЦ.** Вас чакае нейкая вяршыня, да якой вы ішлі доўгім і цяжкім шляхам. Добра было б не прапусціць знак, які паказвае кірунак руху на апошніх метрах, і не праскочыць міма... Майце на ўвазе, што стане відаць праўдзівы ўзровень вашых ведаў і кваліфікацыі, наўрад ці ўдасца нешта схаваць. У панядзелак не разменьвайцеся па дробязях. Серада — спрыяльны дзень для пачатку самаўдасканалення і пераўтварэння. У чацвер важна не страціць кантроль над падзеямі, што адбываюцца, не верце чуткам і плёткам, ваша інтуіцыя акажа вам неацэнную паслугу.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні на працы спатрэбіцца ўсё ваша самавалоданне, каб захоўваць спакой і не баяцца перамен. У сярэдзіне тыдня магчыма ўскладненне адносін з блізкімі сваякамі, затое з сябрамі — поўнае паразуменне. У чацвер асцерагайцеся вострых канфліктаў. Паспрабуйце зразумець апанентаў. У пятніцу працы ад вас будуць чакаць ініцыятывы і дзеяння, накіраваных на выпраўленне цяперашняй, не самай удалай сітуацыі.

**ВАДАЛІЎ.** Хай ваша сціпласць абмяжуецца тым, што вы не будзеце шмат расказваць пра свае дасягненні. Аднак у куце ўсё ж не адседжвайцеся, праявіце актыўнасць, прымайце рашэнні, як бы цяжка ні было рызыкнуць узяць на сябе адказнасць. Верце сваім пачуццям, не такім важным акажацца вынік, колькі ваш настрой на перамогу і дасягненне мэты.

**РЫБЫ.** Панядзелак і пятніца могуць стаць самымі напружанымі днямі тыдня. Праца пагражае паглынуць большую частку вашага часу. Давядзецца разрывацца паміж прафесійнымі абавязкамі і сямейнымі праблемамі. Не забывайцеся пра блізкіх людзей, ім можа спатрэбіцца ваша дапамога. У сераду і чацвер адчуеце, што рухаецеся ў правільным кірунку, у вас ёсць сябры і аднадумцы.

## Чацвер, 19 красавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.45** «Зона Х». (16+).
**9.10, 22.55 Серыял «След» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Напарніцы» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.40** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.40, 15.25 Серыял «Клан ювеліраў. Здрада» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** Дак. фільм (12+).
**0.25** «Сфера інтарэсаў».
**1.25** «Дзень спорту».
**1.40 Серыял «Дзяжурны ўрач». Заключная серыя (16+).**

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.40** «Тэлебарометр».
**9.05, 19.45 Серыял «Сляпая». (16+).**
**10.05, 17.40 Серыял «Акадэмія». (16+).**
**12.05, 22.05** «Арол і рэшка. Юбілейны». (16+).
**13.10** «Паненка-сялянка». (16+).
**14.15** «На нажах». (16+).
**15.20, 23.05 Серыял «Найлепшы тыдзень майго жыцця». (16+).**
**16.15** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**16.20, 0.00** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.10** «Багіня шопінгу». (16+).
**20.50** «Абмен жонкамі». (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранакан».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня». Капусткі з мачанкай.
**8.05, 12.00, 19.55** Навіны культуры.
**8.20, 12.15** Гэты дзень.
**8.25, 18.20 «Вечны ключ». Драма (12+).**
**9.35, 17.40** «Апошні дзень». Мікалай Яроменка (12+).
**10.15, 15.45 «Не хлебам адзіным». Маст. фільм (12+).**
**12.55** «Беларусь як песня». Тамара Пячынская.
**13.20** Канцэрт Нані Брэгвадзе і Вахтанга Кікабідзэ.
**14.15, 22.00** «Зафрантавыя разведчыкі». Дак. серыял. (12+).
**14.50, 21.05 «Без права на памылку». Маст. фільм. (16+).**
**19.30** «Запіскі на палях». Максім Багдановіч.
**20.10** «Беларуская кухня». Кішка.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака БССР Валянціна Волкава.

### Беларусь 5

**6.55** Козел пра футбол.
**7.10** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. БАТЭ (Барысаў) — «Нёман» (Гродна).
**9.05** На шляху да ЧС—2018. Візітоўка каманд. Відэачасопіс.
**9.35** Слэм-данк.
**10.05** Хакей. КХЛ. Фінал. 3-і матч. ЦСКА (Масква) — «Ак Барс» (Казань).
**12.00** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. «Дынама» (Брэст) — «Днепр» (Магілёў).
**13.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Борнмут» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**15.45** Мастацкая гімнастыка. Этап Кубка свету. Пезаро.
**17.45** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**20.05** Свет англійскай прэм'ерлігі. Відэачасопіс.
**20.35** Легенды сусветнага спорту.
**21.05** Авертайм.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Бернлі» — «Чэлсі». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.45** Трэніровачны дзень.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Аляксандр Збруеў. Тры гісторыі кахання» (12+).
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Легенды цырка» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Узыходжанне на Алімп» (16+).**
**1.15** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Гульня ў імітацыю» (16+).**
**10.40, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30** «Следакі» (16+).
**11.55, 17.50 «Водблiскі». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.50, 20.35 «Уцякач». Серыял (16+).**
**15.35** «Ежа багоў» (16+).
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).

**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
**22.15** «Глядзець усім!» (16+).
**23.50** «Аўтапанарама» (12+).
**0.10** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.55 «Каманда Чэ». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00, 8.05 Серыял «АСА» (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.05, 13.15, 19.20 Серыял «Пятніцкі». 5—8-я серыі (16+).**
**14.00, 4.15** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.10, 2.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**22.10 Маст. фільм «Падарожжа ў сакавіку» (16+).**
**0.00** Навіны (бягучы радок) у поўнач.
**0.10 Маст. фільм «Дзень залежнасці» (16+).**
**1.45** «Іншы свет» (16+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 20.40 Серыял «Бярозка». (12+).**
**13.30** «Пакой смеху». (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.30, 23.10 Серыял «Каменская». (16+).**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след». (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы». (16+).**
**9.40, 23.10** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05, 16.35 Серыял «Брацекі». (16+).**
**17.25** «ДНК». (16+).
**19.45 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч». (16+).**
**21.25 Серыял «Пяць хвілін цішыні». (12+).**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**
**0.35** «Гісторыя міліцыі ў асобах». (12+).

### 8 канал

**7.00, 16.00, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.30, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.20 Серыял «Макс» (16+).**
**9.05, 19.45 Серыял «Я пачую цябе» (16+).**
**10.00** «Майстар-клас».
**10.10** «Здароўе».
**10.55 Драма «Да і пасля» (12+).**
**12.45 Серыял «Каханне удоўнае» (16+).**
**14.30 Меладрама «Валянцін і Валянціна» (12+).**
**16.05** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.10** «Мультпарад».
**16.25** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**16.55 Серыял «Анёлы» (16+).**
**18.25 Серыял «Абаронца» (16+).**
**19.15** «Фэшн is my прафэшн».
**19.25** «Пра спорт».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15 Драма «Сахара» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 16.15** Серыял «Варонінbackgroundы». (12+).
**7.20, 4.20** М/ф «Марын і яго сябры». (0+)
**7.50, 4.45** М/ф «Скубі Ду». (6+)
**8.20** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**8.40** «Ералаш». (6+)
**9.20, 20.00** Серыял «Улётны экіпаж». (16+).
**10.25** Баявік «Апошні кінагерой». (12+).
**12.20** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00, 2.40** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**14.00, 1.50** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**15.10, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 23.25** «Уральскія пельмені». (16+).
**19.00** Серыял «Івановы — Івановы-2» (16+).
**21.10** Баявік «Скалалаз». (16+).
**0.00, 3.30** Серыял «Выжыць пасля». (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.15** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Тамара Сёміна.
**7.05** «Пешшу...» Масква мецэнацкая.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.05** «Твар на мішэні». Маст. фільм. 1-я серыя.
**9.15** «Рускі стыль». «Студэнцтва».
**9.40, 19.45** Галоўная роля.
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.20** ХХ стагоддзе. «Разам з Дунаеўскім».
**12.10** «Феномен Кулібіна». Дак. фільм.
**12.55** «Абсалютны слых».
**13.40** «Дзіўнае ператварэнне тыраназаўра». Дак. фільм.
**14.30** «Містыка кахання». «Андрэй Белы і Маргарыта Марозава».
**15.10, 1.40** Манрэальскі сімфанічны аркестр. Творы Э. Грыга і Я. Сібеліуса.
**16.15** Мая любоў — Расія! «Быць татарынам».
**16.50** Да 85-годдзя Валерыя Ускова. «Лінія жыцця».
**18.45** «Астравы». Элем Клімаў.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** Прыступкі цывілізацыі. «Эвалюцыя чалавека. Як мы тут апыніліся?» Дак. фільм.
**21.35** «Энігма. Крысціян Тылеман».
**22.20** «Медычы. Уладары Фларэнцыі». Серыял (18+).
**23.35** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**1.20** Сусветныя скарбы. «Бругге. Сярэднявечны горад Бельгіі». Дак. фільм.
**1.40** Манрэальскі сімфанічны аркестр. Творы Э. Грыга і Я. Сібеліуса.
**2.50** «Наваі». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітковскім: «Біржавы рух». 2006 год (12+).
**7.10** «Гутарка з Прэзідэнтам СССР». 1991 год (12+).
**7.45, 08.40, 9.40, 11.00, 14.05, 15.40, 17.00, 18.55, 20.50, 21.40, 23.00, 2.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**8.05** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Па абодва бакі закона». 1992 год (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Сляем, сябры!» з Тацццяной Візбар. 2007 год (12+).
**13.05, 19.10** Маст. фільм «Бронзавая птушка» (6+).
**14.45, 20.40** М/ф «Прыгоды парасяці Фунціка» (0+).
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока». «Акварыум». 2-я частка. 2007 год (12+).
**20.15** Фільм-канцэрт «...жадаем шчасця вам». 1985 год (12+).
**23.40** Маст. фільм «Удача» (12+).
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Дип Перпл». 2005 год (18+).
**1.15** «Мы Вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресение». 1994 год (16+).
**2.25** «Перапынак». Маст. фільм (12+).

### EuroSport 1

**4.00, 9.30, 14.00, 18.00, 21.00, 0.35** Веласпорт. «Тур Альп».
**5.00, 16.30, 22.00, 1.30** Веласпорт. «Тур Харваты».
**6.00, 10.30, 18.30** Веласпорт. «Флэш Валонь».
**7.30, 19.30** Футбол. «ФІФА».
**8.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**8.30, 20.00** Аўтагонкі. Формула Е.
**12.00, 23.00, 2.30** Снукер. UK Championship. Фінал.

### Кінакамедыя

**0.55** Прыкінься маім мужам. (16+).
**2.50** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**3.15** Мамчын сынок. (12+).
**5.05** Ашаламляльныя фантазіі Чарлі Свона-Трэцяга. (16+).
**6.40** Выкрутасы. (12+).
**8.35** Пўяная ліга. (16+).
**10.10** Чумавыя боты. (16+).
**12.10** З 13 у 30. (12+).
**14.05** Вулкан страсцей. (12+).
**15.45** Вельмі дрэнная настаўніца. (18+).
**17.25** Джэнтльмены, удачы! (12+).
**19.30** Паляўнічыя на прывіды. (6+).
**21.25** Эвалюцыя. (12+).
**23.20** Джулі і Джулія: гатуем шчасце па рэцэпце. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.15** «Доктар I...» (16+).
**8.45, 19.00, 2.25** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.15, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.55, 17.20** «Варажбітка» (12+).
**13.30, 16.20** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**14.25** «Простыя складанасці» (12+).
**15.30** «Натуральны адбор» (12+).
**20.55** «Паненка і хуліган». Серыял (12+).
**21.55** «Савецкія мафіі» (16+).
**22.45** «90-я» (16+).
**23.35** «Грань». Серыял (16+).
**0.20** «Легенда Зора». Вестэрн (6+).
**5.30** «Лінія абароны» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 16.15** Мой хлопчык (12+).
**8.05** Троя (16+).
**11.10** Апалон 13 (12+).
**13.50** Адданы садоўнік (16+).
**18.10** Смурфікі (12+).
**20.10** Браты Блюз 2000 (16+).
**22.30** Анёлы Чарлі (12+).
**0.25** Удачы, Чак! (18+).
**2.20** Усмешка Моны Лізы (12+).
**4.20** Сужэнцы Морган ва ўцёках (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Як я правёў гэтым летам (16+).
**8.45** Ён — Дракон (6+).
**10.50** Варашылаўскі стралок (16+).
**12.45** Пастарайся застацца жывым (16+).
**14.05** Іронія лёсу. Працяг (12+).
**16.20, 4.35** Тры шчаслівыя жанчыны. (12+).
**18.00** Ледакол (12+).
**20.20** На кручку! (16+).
**22.10** Унук касманаўта (12+).
**23.45** Арэлі (16+).
**1.30** Крыніца (12+).
**3.15** Жыць (16+).

### National Geographic

**6.00, 15.15** Найбуйнейшы ў свеце рамонт. (12+).
**6.50** Суперзбудаванні. (12+).
**7.40, 13.15** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.25, 11.40, 16.50, 20.40** Аўтаs SOS. (12+).
**9.15** Дзікі тунец. (12+).
**10.05** Цуды інжынерыі. (12+).
**10.55** Золата Юкана. (12+).
**12.25** Прарыў. (12+).
**14.05** Займальная навука. (12+).
**14.25** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**16.05, 19.55, 0.35, 3.00** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**18.20** Сапраўдны суперкар. (12+).
**19.05, 2.10** Праслухоўка арміі Гітлера. (16+).
**22.10** Героі нябесная вайны. (16+).
**23.00, 1.20, 4.45** Служба бяспекі аэрапорта. (18+).
**23.45** Дзіўная Другая сусветная. (16+).
**5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).

### Discovery

**8.00, 17.05, 22.00, 4.40** Махінатары.
**8.50, 15.15, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена?
**9.45, 16.10, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады.
**10.40** Як гэта ўстроена?
**13.25, 19.00, 5.30** Хуткія і гучныя.
**14.20, 18.00** Разбуральнікі легенд.
**20.00, 0.00** Залатая ліхаманка.
**2.00** Салдаты няўдачы.
**2.55** Залаты шлях.
**7.10** Выжыць любой цаной.

# ХТО ТУТ ГАСПАДАР?

**Карэспандэнт «МС» высвятляла, з якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца пры добраўпарадкаванні могілак у сельскай мясцовасці**

**У АГРАГАРАДКУ Лясная грамадзянскія могілкі знаходзяцца амаль у цэнтры населенага пункта. І калі б не крыжы і помнікі, можна было б прыняць гэта месца за парк. Кажуць, што тут пахаваны яшчэ салдаты рускай арміі, якія загінулі падчас бітвы са шведамі ў 1708 годзе. Пра той легендарны бой нагадвае гранітная стэла 1908 года. Некалькі гадоў таму вандалы знялі з яе металічныя крыжы. Замест іх Лапаціцкі сельвыканкам устанавіў новыя — мармуровыя. І паставіў з гэтага ж матэрыялу невялічкія слупы замест цагляных, якія амаль рассыпаліся.**



Хто тут пахаваны — невядома.

## КЛОПАТНАЯ ГАСПАДАРКА

Наогул на тэрыторыі сельсавета 16 могілак. Нагляд за імі адымае добры кавалак часу, а галоўнае, патрабуе грошай. **Старшыня сельскага Савета Сцяпан БАЙЦОЎ** перажывае, што ў свой час не паспеў перадаць іх на баланс камунальнікаў. Дакладней, не знайшлося грошай, каб навесці парадак з дакументацыяй. Няма іх і зараз. Для таго каб усё ўзаконіць, спатрэбіцца не менш за 500 рублёў на кожныя могілкі. Дзе ўзяць такія сродкі? (Для параўнання: летась на знос састарэлых будынкаў сельсавет атрымаў усяго 200 рублёў.)

За апошнія гады мясцовыя ўлады правялі цэлую даследчую работу, каб падлічыць усе пахаванні. Гэтага патрабуе закон аб рэгістры насельніцтва, які ўступіў у дзеянне ў ліпені 2013 года.

> «Для сельскіх могілак павінна быць асобная нарматыўная база, дзе былі б улічаны ўсе нюансы, якія не сустракаюцца ў гарадскіх умовах.

— У горадзе такі ўлік дазволіў навесці парадак, але сельскія могілкі — гэта зусім іншае, і нас з горадам параўноўваць нельга, — кажа Сцяпан Байцоў. — Па сутнасці, для нагляду за сельскімі могілкамі патрэбны асобны чалавек. Самыя аддаленыя ад Лапацічаў пахаванні знаходзяцца на адлегласці 16 кіламетраў. Як прасачыць, што там у дадзены момант ніхто нікога не хавае? У нас два населеныя пункты былі ліквідаваны ў сувязі з наступствамі аварыі на ЧАЭС — Чырвоная Слабада і Кашалёў. Але на могілках гэтых вёсак дагэтуль робяць пахаванні, прычым часта ўпотай, без папярэджання ўлад. І гэта пры тым, што ўсюды вісяць аб'явы, што трэба спачатку папярэдзіць сельсавет. Нехта звяртаецца, але не ўсе. У горадзе такія варыянты нават не разглядаюцца. А мы павінны кожны на сваім месцы шукаць нейкае выйсце. Пракантраляваць гэта проста немагчыма.

Па сутнасці, сельскія могілкі — гэта гектар зямлі з лесам, дзе шмат старых пахаванняў, часта наогул без крыжоў і іншых апазнавальных знакаў. Але і яны павінны быць неяк пазначаны. Сцяпан Байцоў дэманструе схему пахаванняў, дзе кожнае пазначана квадрацікам з лічбай. Уражанне такое, што кожны як хацеў, так і хаваў. У выніку атрымалася нешта незразумелае, хаатычнае. Да «карты» прыкладаецца спіс, дзе насупраць парадкавага нумара стаіць прозвішча, але часцей проста сціплы крыж. Бо, паўтаруся, невядома, хто там пахаваны.



«Пахавальная» матэматыка.

— Гэта даныя на май 2016 года, — удакладняе кіраўнік мясцовай улады. — Перапіс рабілі ўсім сельсаветам, нам дапамагалі школы і ўстановы культуры. Усе гэтыя звесткі былі занесены ў спецыяльны рэспубліканскі рэестр. А ніадзна прыйшлі ўказанні, каб мы ўсё перарабілі з папраўкай на 2013 год. Зноў трэба заказваць спецыяльныя кнігі і брацца за справу. А галоўнае, не растлумачылі, — навошта? Для сельскіх могілак павінна быць асобная нарматыўная база, дзе былі б улічаны ўсе нюансы, якія не сустракаюцца ў гарадскіх умовах. Тады і людзі ведалі б, што калі яны не прыйдуць у сельсавет і не папярэдзяць, дзе збіраюцца хаваць сваіх родных, то будуць несці адказнасць. І было б лепш, калі б гэты працэс кантралявалі не сельсаветы, а камунальныя службы — ЖКГ. Зараз вось трэба могілкі прывесці ў парадак да Радаўніцы — аварыйныя дрэвы знесці, смецце прыбраць, агароджу падрамантаваць. Камунальнікам было б прасцей гэта рабіць, падобнымі справамі яны займаюцца пастаянна. У іх ёсць і спецыяльная тэхніка, і інвентар, і людзі. А што можам мы, калі на ўвесь сельсавет толькі я ды кіраўнік спраў?

## АБЯЗЛІЧАНАЯ ПАМЯЦЬ

Едзем на бліжнія могілкі ў вёску Пацяраеўку. Дарога ідзе па ўскрайку лесу. Колькі гадоў гэтаму жалобнаму месцу, можна толькі здагадвацца. Іржавыя металічныя крыжы без апазнавальных знакаў, струхлелыя ад часу драўляныя слупы, ад якіх адваліліся гарызантальныя перакладзіны, гранітныя помнікі з тварамі памерлых — усё тут даўным-даўно перамяшалася. Вакол могілак цягнецца драўляная агароджа. Без фарбы яна хутка страціць выгляд, але пакуль грошай на гэта ў сельвыканкама няма.

> Для збору смецця зроблена асобная пляцоўка. Але Сцяпан Байцоў не вельмі спадзяецца, што яна ўсімі будзе выкарыстана па прызначэнні. Хутчэй за ўсё, смецце зноў прыйдзецца шукаць па лесе.

Народ часта хавае пажоўклую траву і старыя вянкі дзесьці па суседстве — на закінутых пахаваннях. У будні дзень ахвотных навесці парадак на могілках няшмат. Здалёк заўважаем жанчыну і маладога чалавека, якія шчыруюць з граблямі і мятлой.

> «Два населеныя пункты былі ліквідаваны ў сувязі з наступствамі аварыі на ЧАЭС — Чырвоная Слабада і Кашалёў. Але на могілках гэтых вёсак дагэтуль робяць пахаванні, прычым часта ўпотай, без папярэджання ўлад.

— Могілкі старадаўнія, асабліва калі прайсці крыху далей, — махае рукой углыб лесу Надзея Ісакаўна. — Тут пахаваны мае бацькі, дзве сястры і нават дзед. Ён памёр, калі мяне яшчэ на свеце не было. Вось разам з унукам Сяргеем прыйшлі прыбраца. Пакуль ёсць магчымасць, самой хочацца гэта рабіць. Гэта ж мой абавязак.

Цікаўлюся, а чаму ні на адным з крыжоў няма таблічак з прозвішчамі. Жанчына паціскае плячыма: маўляў, а навошта, я ж і так ведаю, хто дзе. Унук кажа, што ўжо падумвае, каб зрабіць пахаванні пазнавальнымі. Але, кажа, спачатку грошы трэба сабраць на помнікі. Сціплая таблічка — гэта не тое... І мяркуючы па іншых неапазнаных крыжах, так думаюць многія.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАРАДАК

По інфармацыі аддзела добраўпарадкавання і работы з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі Магілёўскага абласнога ўпраўлення ЖКГ, на тэрыторыі вобласці больш за 2700 могілак, з іх толькі 176 на балансе камунальнікаў. Усе астатнія замацаваныя за сельскімі выканаўчымі камітэтамі. Адказныя за стан месцаў пахавання павінны клапаціцца пра тое, каб вакол могілак была агароджа вышынёй не менш за 1 метр, меліся пляцоўкі для складавання смецця і быў наладжаны вываз адходаў. Акрамя гэтага, раз на два гады павінна праводзіцца інвентарызацыя могілак — з мэтай выяўлення самавольных пахаванняў і ўчасткаў з разбуранымі помнікамі. Таму вельмі важна, каб людзі ўсё ж такі ідэнтыфікавалі помнікі і пазначалі на іх імёны, а таксама даты жыцця і смерці родных. Гэта спатрэбіцца, калі помнік знаходзіцца ў аварыйным стане і неабходна знайсці чалавека, які даглядае месца пахавання. А яшчэ, напрыклад, для таго, каб своечасова ўстанавіць злачынства. Яшчэ свежыя ў памяці дзеянні магілёўскіх псеўдарыэлтараў, якія забівалі людзей дзеля іх кватэр і хавалі сляды сваіх злачынстваў на сельскіх могілках...

МЕРКАВАННІ

## СПРАВА ПАМЯЦІ

**Радаўніца — асабліва для праваслаўных вернікаў свята, калі памінаюць нябожчыкаў. Сама назва заклікае не сумаваць, а радавацца іх пераходу ў вечнае жыццё. Нездарма ў народзе кажуць: «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а к вечару скачуць». У гэты дзень беларусы абавязкова завітаюць на могілкі, прыбяруць іх, пакінуць на магіле асвечанае яйка. Напярэдадні свята актуальным становіцца пытанне: хто павінен даглядаць могілкі — камунальныя службы, сельвыканкамы або сваякі памерлых?**

**Марыя АФАНАСЕНКА, дэпутат Брэсцкага абласнога Савета:**

— Цяпер я жыву ў Брэсцкай вобласці, а з 1994 па 2000 год жыла ў Гомельскай. У Гомельскай вобласці ўспамінаюць блізкіх, якія памерлі, на Радаўніцу. У Брэсцкай прынята наведваць могілкі на Вялікдзень. Перад гэтым святам родныя прыбіраюць магілы, упрыгожваюць іх, тут вельмі трапяткое стаўленне да нябожчыкаў. У апошні час месцы пахавання сталі зонай адказнасці камунальных служб. Установка кантэйнераў, вываз смецця, знос аварыйных дрэў — гэта, на мой погляд, абавязак ЖКГ. Чысціня, добраўпарадкаванне могілак — задача родных. У рэгіёне, дзе я працую дырэктарам школы, мы сутыкнуліся з праблемай, што частка могілак застаецца недагледжанай. Над магіламі памерлых настаўнікаў, работнікаў школы наш калектыў узяў шэфства. Мы перад Вялікаднем, на Дзяды іх прыбіраем. Да мяне, як дэпутата, аднойчы звярталіся жыхары двух сельсаветаў, калі паваленыя дрэвы пашкодзілі могілкі. Мы папрасілі дапамогі ў ЖКГ, і яны прыбралі і гэтыя паваленыя, і іншыя аварыйныя дрэвы.

**Мікалай КАНАПАКА, дырэктар УП «Чэрвеньская ЖКГ»:**

— У нашым горадзе ёсць супрацоўнік, адказны за могілкі (могілак за намі замацавана трое), — наглядчык. Прыборкай займаецца брыгада па добраўпарадкаванні з 18 чалавек. Усталяваны кантэйнеры для камфорту тых, хто прыязджае на магілы да Вялікадня і Радаўніцы. Па меры іх запаўнення мы вывозім смецце. Таксама абкошваем тэрыторыю могілак, даглядаем агароджу — рамантуем і падфарбоўваем.

**Ала СТОЦІК, дэпутат Глыбоцкага раённага Савета:**

— У першую чаргу, я лічу, парадак павінна наводзіць насельніцтва пэўнай мясцовасці... Сельвыканкамы, калі ёсць фінансаванне, займаюцца агароджваннем могілак, але і гэта з дапамогай жыхароў. Мабыць, у горадзе добраўпарадкаваннем больш займаюцца службы ЖКГ, а ў вёсках — гэта задача насельніцтва. Але трэба ўлічваць факт, што вёскі старэюць, таму з-за свайго ўзросту чалавек не заўсёды можа прыбраць магілу блізкага. Родныя прыязджаюць, але ў асноўным на выхадныя. Зараз у нас за могілкамі замацаваны розныя арганізацыі, якія дапамагаюць у вырашэнні пытання добраўпарадкавання.

**Уладзімір СЯДЛОЎСКІ, старшыня Мікалаеўскага сельвыканкама Шумілінскага раёна:**

— Дагляд могілак — гэта наш сумесны з жыхарамі абавязак. Але, на мой погляд, прыбіраць месцы пахавання павінны і родныя. Да нашага сельсавета адносяцца 16 грамадзянскіх пахаванняў. Мы з калектывам прыбіраем іх, дапамагаем ЖКГ — прывозім пясок, забіраем смецце. Раней для прыгажосці на могілках садзілі дрэвы, а зараз яны могуць стаць прычынай праблем, таму іх зразаем. У асноўным узрастае актыўнасць насельніцтва напярэдадні Радаўніцы. Але не ўсе могуць прыехаць і навесці парадак. Старым людзям, якія засталіся ў вёсках, цяжка прыбраць магілу. Але ўзровень адказнасці родных розны ў кожным месцы. Дзесьці больш сумленна падыходзяць да гэтага пытання, дзесьці наадварот. Таму дапамагаем мы, мясцовая ўлада.

**Марыя ДАДАЛКА.**

ЗДАРЭННІ

## Вядзецца следства...

### Пенсіянерка, якую збілі і абрабавалі, выпісалася з бальніцы

**Ноччу ў дом да 74-гадовай жыхаркі аграгарадка Русіно Баранавіцкага раёна прабраліся зламыснікі ў масках і сталі патрабаваць грошы. Бандыты не проста патрабавалі, яны білі жанчыну, прывязалі яе да ложка будаўнічай стужкай, а зверху замацавалі шторай, якую знялі з акна.**

Вядома, пад пагрозамі гаспадыня сказала, дзе ляжаць грошы. Злыдні забралі 250 рублёў і сышлі. Яна ж тузалася пад тымі прывязкамі да ранку, і недзе каля сямі раніцы змагла вызваліцца. Потым неяк выйшла на вуліцу, там яе ўбачылі суседзі. Апошнія і выклікалі хуткую дапамогу, міліцыю.

Ад перажытага шоку — уявіце толькі, рабаўнікі выставілі акно і ўлезлі ў дом у дзве гадзіны ночы, калі гаспадыня спала, — яна не змагла дакладна прыпомніць колькі іх было. Сказала толькі, што налётчыкі нацягвалі на твары шапкі ці шалікі, каб іх нельга было пазнаць. Яшчэ пацярпелая разглядзела нібыта жаночы сілуэт. Як заўважыў афіцыйны прадстаўнік СК па Брэсцкай вобласці Дзмітрый ІВАНЮК, следству яшчэ трэба высветліць, колькі было рабаўнікоў.

У Вялікалуцкім сельскім Савеце расказалі, што пенсіянерка прайшла курс лячэння ў Баранавіцкай гарадской бальніцы. Зараз яна выпісалася з бальніцы і вярнулася ў свой дом. Пражывае бабуля адна фактычна на краі вёскі. Аматары чужых грошай залезлі да яе акурат праз дзень пасля атрымання пенсіі. У Брэсцкім абласным упраўленні ўнутраных спраў паведамілі, што пошук злачынцаў працягваецца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

АГУЛЬНАЯ СПРАВА

# ГАЛОЎНАЯ ПРАБЛЕМА — СТАРЫЯ ДРЭВЫ

### Перавод могілак на баланс ЖКГ азначае якасна новы ўзровень абслугоўвання і добраўпарадкавання

**НА ТЭРЫТОРЫІ Опальскага сельсавета ў Іванаўскім раёне ўсяго дзесяць могілак. З іх дзевяць працуюць і адны закрытыя. Не так даўно завяршыўся працэс перадачы могілак на баланс раённага ЖКГ. І адразу намеціліся змены да лепшага, заўважыла старшыня сельвыканкама Галіна ВАРАШЫЛАВА.**

Раней жа могілкі не значыліся на балансе мясцовай улады, таму на іх утрыманне і добраўпарадкаванне грошы не выдзяляліся. Сельвыканкамы займаліся гэтай работай ледзь не на грамадскіх пачатках. Таму што грамадскія могілкі — надзвычай важныя аб'екты для вёскі і таму што знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета. Большая частка работы па добраўпарадкаванні рабілася за сродкі, якія збіралі грамадзяне. Старасты абыходзілі вёскі, складалі спісы... Абсалютная большасць жыхароў здавала грошы на агульную справу. Іншым разам дапамагалі сельгаспрадпрыемствы, іншыя суб'екты гаспадарання, якія дзейнічалі на тэрыторыі.

Апошнім часам галоўнай праблемай месцаў пахавання становяцца старыя дрэвы. Іх трэба зносіць. У названым сельсавеце гэтай работай некалькі гадоў займалася камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Псышчаўскае». Вясковае КУП набыло свой гідрапад'ёмнік, работнікі прайшлі перападрыхтоўку, атрымалі сертыфікаты, пасля гэтага стала магчыма зносіць нават самыя вялікія, аварыйныя дрэвы.

> На закрытых могілках вёскі Залядынне камунальнікі прыбралі 44 дрэвы.
> У сельвыканкама для гэтага не знайшлося б ні сіл, ні сродкаў.

Калі, напрыклад, пілавалі дрэвы на могілках у Лядавічах, то сутыкнуліся з праблемай паломкі інструментаў. А псавала іх... мінулая вайна. Тут прайшлі жорсткія баі. У драўніне захраслі асколкі, на якія калі трапіць піла зубам, дык і мусіш мяняць частку інструмента. Канстанцін Міхалевіч, начальнік участка «Псышчаўскага», мае цэлую калекцыю такіх асколкаў. Іх назбіралі рабочыя падчас распілоўвання. Значыць, дрэвы гэтыя старэйшыя за Перамогу. І іх, вядома, трэба было зразаць.


Фота Ірыны СІДАРОК.

Такім чынам, КУП расчысціла могілкі ў вёсках Упірава, Псышчава, іншых населеных пунктах. Засталася яшчэ ў Опалі, некалькі дрэў трэба спілаваць у Лядавічах. Акрамя таго, на кожных могілках трэба пастаянна падтрымліваць парадак, падкошваць траву, прыбіраць смецце.

— Раней, — згадвае старшыня сельскага Савета, — падкошваць удавалася некалькі разоў на год. І кожны раз гэта станавілася праблемай, бо не было грошай, каб аплаціць работу. Даводзілася выкручвацца па-рознаму, напрыклад прасіць сельгаспрадпрыемствы выконваць гэту работу на ўмовах спонсарства. А зараз ЖКГ вызначыў двух рабочых, якія будуць адказваць за парадак на могілках. Адзін — па псышчаўскай зоне, другі — па опальскай. У свой час Псышчаўскі сельсавет быў далучаны да Опальскага, тэрыторыі значныя, таму і спатрэбіліся дзве штатныя адзінкі. А яшчэ вырашана праблема працаўладкавання людзей, бо зімой яны працавалі качагарамі, а з сярэдзіны красавіка да сярэдзіны кастрычніка будуць даглядаць могілкі. Супрацоўнік камунальнай гаспадаркі, які адказвае за псышчаўскую зону, ужо прыступіў да сваіх абавязкаў. І да Вялікадня паспеў прыбраць тэрыторыю вакол могілак, куды з ветрам трапіла смецце альбо яго выкінулі нядобрасумленныя сваякі ў працэсе прыборкі магіл. Каля кожных могілак, заўважыла Галіна Варашылава, ёсць кантэйнеры альбо абсталяваная пляцоўка для часовага захоўвання адходаў.

**Дырэктар Іванаўскага ЖКГ Сяргей ВАРОНІН** кажа, што працэс перадачы могілак на баланс камунальнай гаспадаркі падыходзіць да завяршэння. Прынята ўжо 91 могілка, у працэсе работы па перадачы толькі адзін Бродніцкі сельсавет. І ён стане апошнім у раёне.

**Начальнік сектара названага ЖКГ Сяргей БАРОДКА** удакладняе, што па кожным сельсавеце прымалася рашэнне райвыканкама, у якім указана, як сельвыканкамы будуць аказваць садзейнічанне ў працэсах добраўпарадкавання. Гэта значыць, вітаецца грамадская ініцыятыва. Будзе працягвацца практыка суботнікаў, старасты вёсак будуць усяляк дапамагаць арганізоўваць насельніцтва. Бо гэта агульная справа. Сяргей Віктаравіч адзначыў, што паўсюль зараз вызначаюцца стаўкі рабочых па доглядзе могілак. А самай складанай па-ранейшаму застаецца работа па зносе дрэў.

Першымі на свой баланс раённае ЖКГ прыняло могілкі Мотальскага і Адрыжынскага сельсаветаў некалькі гадоў таму. **Старшыня Адрыжынскага сельскага Савета Уладзімір КЛІМУК** расказаў, што перадалі могілкі камунальнай гаспадарцы яны ў належным выглядзе. Жыхары вёсак збіралі грошы. У многім дапамаглі землякі-спонсары. Менавіта сельвыканкам знайшоў каардынаты ўраджэнцаў гэтых тэрыторый, а цяпер бізнесменаў з Санкт-Пецярбурга Васіля Амялюсіка і Мікалая Галуца. Прадпрымальнікі адклікнуліся на пісьмы і ўклалі пэўныя сродкі ў добраўпарадкаванне могілак. Так, Мікалай Амялюсік прафінансаваў узвядзенне жалезабетоннай агароджы вакол могілак у вёсцы Падышча, дапамог фінансава і яго калега. Пры ўдзеле насельніцтва знеслі старыя дрэвы на могілках у Смольніках, Баландзічах, Адрыжыне.

— Цяпер з пераходам месцаў пахавання на баланс ЖКГ работа выйшла на новы ўзровень, — расказвае кіраўнік мясцовай улады. — Вось, скажам, на закрытых могілках вёскі Залядынне камунальнікі прыбралі 44 дрэвы. У сельвыканкама для гэтага не знайшлося б ні сіл, ні сродкаў. Цяпер знята вечная праблема падкосаў травы, вывазу адходаў з пляцовак. Усё гэта робіцца дакладна і па графіку. Тым больш што ў Адрыжыне ёсць участак ЖКГ і работнікі, што зімой абслугоўваюць кацельную, а летам пераключацца на работу па добраўпарадкаванні могілак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Іванаўскі раён.*


БПС-СБЕРБАНК

**Уважаемые Владельцы (физические лица) текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!**

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

Операции по неактивному счету можно совершить в любом подразделении Банка.

**Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефонами:**
**148 – в стационарной сети;**
**5-148-148 – в мобильных сетях;**
**(+375 29/44) 5-148-148 – для международных звонков.**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673
ОАО «БПС-Сбербанк»



**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**
✓ **Оценка всех видов собственности**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БОБРУЙСКТРАНС»**

| № лота | Наименование и характеристики объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. без НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение (профилакторий ЕО) с инв. №710/С-20005, площадью 454,0 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 123. *Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 741000000005001187 площадью 5,3080 га.* Выделение земельного участка будет осуществляться после приобретения объекта с торгов, согласно законодательству Республики Беларусь | **180 000,00 руб.** | **18 000,00 руб.** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 14 мая 2018 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **15 мая 2018 г. в 12.00** по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 123 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 13.04.2018 г. |
| **Условия продажи** | Имущество продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость имущества в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Указанные объекты находятся под арестом (есть разрешение на продажу). Стоимость лота без учета НДС (20 %), сформированная на аукционе при продаже, должна быть перечислена на ОАО «Бобруйсктранс», а сумма НДС (20 %) от цены лота, сформированной на аукционе при продаже, должна быть перечислена на ГУ МФ РБ по Могилевской области за ОАО «Бобруйсктранс». Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел. (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

**Для участия в аукционе необходимо представить:**
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводиться в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация»



# ПА ЗАВЫШАНЫМ КОШЦЕ?

## Чаму вернікі незадаволены рамонтам храма

**У ВЁСЦЫ Зарачанка Гродзенскага раёна вырашылі адрамантаваць касцёл. Жыхары наваколля сабралі сродкі, абмеркавалі з будаўнікамі кошт работ, але неўзабаве высветлілася, што грошай не хапае. Каб працягваць рамонт, зноў спатрэбілася дапамога прыхаджан. Мясцовыя жыхары сталі падазраваць будаўнікоў у завышэнні кошту і нават звярнуліся ў Камітэт дзяржкантролю Гродзенскай вобласці.**

### ПОМНІК АРХІТЭКТУРЫ

Лёс зарачанскага касцёла падобны на лёсы многіх іншых культавых аб'ектаў рэгіёна. Яго таксама не абышла бокам эпоха атэізму, падчас якой храм быў на некалькі дзесяцігоддзяў закрыты. Мясцовыя жыхары прыгадалі, што тут быў склад, дзе захоўвалі лубін.

На пачатку 90-х касцёл вярнулі каталіцкай епархіі і вернікі пачалі яго аднаўляць. Будынак знаходзіўся ў занядбаным стане — выбітыя вокны і дзверы, пашкоджаныя сцены і дах, знішчаныя касцельныя харугвы. Што змаглі, зрабілі ўласнымі сіламі, на іншыя работы запрашалі майстроў. Іх працу аплачвалі тым, што сабралі...

Таксама трэба было набываць і касцельнае начыненне, бо не ўсё захавалася, нягледзячы на тое, што многія жыхары трымалі ў сябе царкоўныя святыні. З адкрыццём храма яны былі вернуты на месца.

Касцёл Нараджэння Панны Марыі ў Зарачанцы можна назваць мясцовай славутасцю. Нельга сказаць, што ён старажытны, але мае пэўную архітэктурную адметнасць. Храм пабудаваны ў 1937 годзе, і летась тут урачыста адзначылі 80-гадовы юбілей. Дарэчы, падчас святкавання мясцовыя ўлады выдзелілі восем тысяч рублёў на добраўпарадкаванне касцёла і навакольнай тэрыторыі.

Разам з тым сам будынак з'яўляецца помнікам архітэктуры, ён узведзены ў стылі неаготыкі, над уваходам узвышаецца двух'ярусная вежа са шпілем. Поўная копія зарачанскага касцёла ёсць пад польскім Беластокам. Відаць, храмы будаваліся адначасова па адным праекце і з аднаго матэрыялу — бутавага каменю.

Дарэчы, у Зарачанку ездзяць вернікі з многіх навакольных вёсак. Старажылы прыгадваюць той час, калі вёска мела іншую назву — Баля Касцельная. Мабыць, з-за прыгожага і велічнага храма.

### РАМОНТ ПРЫСПЕЎ

Трэба сказаць, што рамонтныя работы тут не вяліся з таго часу, як касцёл адкрылі, гэта значыць з 90-х гадоў. За такі вялікі перыяд будынак састарэў, пацёк дах, на сценах з'явіліся трэшчыны, пачала адвальвацца тынкоўка, фасад выглядаў непрэзентабельна... Вось тут касцельны камітэт на чале з настаяцелем і задумаўся аб капітальным рамонце. Трэба сказаць, што прыхаджане ідэю падтрымалі і пачалі мэтанакіравана збіраць сродкі.

Дапамагалі старасты вёсак, якія літаральна заходзілі ў кожны дом. Большасць жыхароў — пенсіянеры, але некаторыя з іх ахвяравалі па тысячы рублёў. Да мецэнацтва далучыліся жыхары Гродна, якія нарадзіліся ў гэтых мясцінах, значную дапамогу аказала мясцовая гаспадарка «Зарэчны-Агра». Ініцыятыўнай групе ўдалося сабраць каля 50 тысяч рублёў. Менавіта такі кошт вызначылі для рамонту будынка эксперты.

Пачалі шукаць будаўнічую арганізацыю, якая ажыццявіла б гэты няпросты праект. Разглядалі некалькі варыянтаў. Аліна Дубейка, член касцельнага камітэта, паведаміла, што напачатку спыніліся на падрадной арганізацыі з Мінска. Фірма прапанавала выканаць рамонт за 16 тыс. долараў, але работнікаў неабходна было забяспечыць жыллём і харчаваннем, іншыя прэтэндэнты на падрад патрабавалі дадатковыя інструменты, падсобных рабочых.

Урэшце спыніліся на гродзенскай будаўнічай фірме, з якой сышліся ў кошце. Да таго ж будаўнікі ўжо мелі вопыт рамонту храмаў, трымалі ў штаце альпіністаў. Пасля падпісання дагавора адразу прыступілі да работы.

> Але завяршыць рамонт не атрымалася. На заяўленую суму будаўнікі адрамантавалі і ўцяплілі дах, замянілі гнілыя драўляныя бэлькі ў вежы і вокнах, патынкавалі і пафарбавалі сцены знутры касцёла.

Летам з будаўнікамі за гэта і расплаціліся. Але на аднаўленне фасада сродкаў ужо не хапіла, таму што, як сцвярджаюць будаўнікі, падчас рамонту спатрэбіліся і не прадугледжаныя планам работы.

### З КОШТАМ НЕ ЗГОДНЫ

Па словах Аліны Дубейкі, сярод вернікаў пачаўся дадатковы збор сродкаў на рамонт фасада. З пэўнымі праблемамі, бо прыход невялікі — каля паўтысячы чалавек, — удалося сабраць неабходную суму. Але ў будаўнічай фірме падлічылі... і выставілі новы кошт. Зноў пачаўся збор сродкаў. На гэты раз жыхары больш зацікавіліся коштам работ. Узнікла пытанне: як атрымалася, што напачатку была заяўлена адна сума, а ў працэсе рамонту яна вырасла? Больш сведамыя вяскоўцы выказалі меркаванне аб завышаных каэфіцыентах і звярнуліся ў Дзяржкантроль з просьбай пералічыць каштарыс.

Што датычыцца якасці рамонту, тут заўваг і прэтэнзій у прыхаджан не ўзнікае. Яны лічаць, што работы выкананы вельмі добра. Гэта пацвердзіла і начальнік упраўлення кантролю бюджэтна-фінансавай сферы КДК вобласці Таццяна Слабыш. Яе падначалены выязджаў на месца і не знайшоў хібаў у выкананай рабоце — дах зроблены якасна. А вось праверка па частцы завышэння аб'ёмаў і кошту работ яшчэ вядзецца. Калі такія факты будуць выяўлены, сродкі прыйдзецца вярнуць, паведаміла ў Камітэце дзяржкантролю.

Між тым чуткі з гэтай нагоды ходзяць розныя... Па факце ж былога настаяцеля не так даўно перавялі ў іншы прыход. Цяперашні ксёндз не схільны праліваць святло на гэтую гісторыю. Яго пазіцыя — міратворчая. Маўляў, трэба ўсё забыць і ўсім дараваць.

Член касцельнага камітэта Аліна Дубейка лічыць, што непаразуменне ў гэтым пытанні ўзнікла яшчэ і таму, што адказныя за рамонт прадстаўнікі касцёла не давалі справаздачу прыхаджанам аб усіх этапах работ. На яе думку, сітуацыя з размеркаваннем сродкаў і каштарысам павінна быць больш празрыстай, а фінансамі могуць распараджацца толькі сумленныя людзі.

Ці пастаўлена кропка ў гэтай справе? Адказ даведаемся пасля таго, як завершыцца праверка. Але ўжо зараз можна сказаць, што наўрад ці такая сітуацыя паўторыцца. Па словах Аліны Мікалаеўны, новы настаяцель — чалавек вельмі ашчадны і ўсё трымае пад асабістым кантролем.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

НАПЯРЭДАДНІ ЛЕТА

# Ямам на дарогах не месца

**Адна з асноўных задач, якая стаіць сёння перад арганізацыямі рэспубліканскай дарожнай гаспадаркі, — навядзенне парадку на дарогах і ў палосах адводу перад летнім сезонам. У адпаведнасці з загадам Мінтранса, увесь комплекс работ плануецца завяршыць у першай палове мая, паведамілі ў прэс-службе міністэрства.**

Гэтым дакументам зацверджаны план-графік падрыхтоўкі дарог, дзе распісаны віды работ і тэрміны іх выканання. Варта адзначыць, што загад прадпісвае ў першачарговым парадку ліквідаваць сезонную ямачнасць. Пры гэтым даручаецца забяспечыць строгае захаванне тэхналогіі і якасці работ, не дапусціць пакідання пасля заканчэння працоўных змен незаштукаваных выемак.

Акрамя таго, дарожнікам трэба будзе ліквідаваць месцы застою вады на праезнай частцы і абочынах, ачысціць дарогі ад рэштак процігалалёдных матэрыялаў, ліквідаваць недахопы ва ўстаноўцы і знешнім выглядзе дарожных знакаў, прывесці ў парадак аўтапавільёны, аўтобусныя прыпынкі, пляцоўкі адпачынку, адрамантаваць і пафарбаваць бар'ерныя агароджы, аднавіць знятыя на зімовы перыяд сігнальныя слупкі. Вялікая праца будзе праведзена ў палосе адводу на высечцы сухіх дрэў і кустоўя, па прафіляванні абочын уздоўж рэспубліканскіх дарог, прывядзенні ў парадак тэрыторый вытворчых баз, будаўнічых гарадкоў, пляцовак для складавання матэрыялаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


Idea Bank

Наименование банка:

## ЗАО «Идея Банк»

www.ideabank.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 1 апреля 2018 года | На 1 января 2018 года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 39 303 | 42 188 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 20 798 | 43 485 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 14 365 | 35 110 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 9 979 | 996 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 231 783 | 203 212 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5 | 5 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 29 865 | 37 894 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 7 482 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 168 | 168 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 26 432 | 28 938 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | **380 180** | **391 996** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 13 355 | 59 523 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 279 791 | 245 541 |
| 20 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 724 | 1 278 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 861 | 3 886 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **296 731** | **310 228** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 26 806 | 26 806 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 7 523 | 6 177 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 10 755 | 10 763 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 38 365 | 38 022 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | **83 449** | **81 768** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **380 180** | **391 996** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 1 апреля 2018 года | На 1 апреля 2017 года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 11 686 | 12 312 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 4 273 | 4 772 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7 413 | 7 540 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 927 | 3 260 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 972 | 1 113 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 955 | 2 147 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (3) | (9) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2 751 | 2 139 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (997) | (2 367) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 769 | 750 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 9 709 | 8 402 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 654 | 447 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 2 519 | 6 085 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 837 | 1 501 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 682 | 4 584 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в рублях | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | - | - |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | - | - |

Председатель Правления Е. М. Папушева

Главный бухгалтер О. В. Глазырина

5 апреля 2018 года

Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (ЗАО «Идея Банк»).
Свидетельство о регистрации от 24 апреля 2004 года.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 25 от 03.06.2013 года.
УНП 807000122



### ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(организатор аукциона)*, по поручению **ОАО «Борисовская швейная фабрика»** (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1. Производственный цех,** общ. пл. 1462,1 кв. м, инв. № 610/D-61785, по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/2-3,** имущество согласно перечня *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов)*.

**Начальная цена с НДС – 73 862,74 бел. руб. *Стоимость снижена на 80 %.* Задаток 10 % (7 386,00 бел. руб.).**

**Лот № 2. Изолированное помещение** общ. пл. 3 992,4 кв. м, инв. № 610/D-65612 по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/1-3**.

**Начальная цена с НДС (20 %) – 176 270,40 бел. руб. *Стоимость снижена на 70 %.* Задаток 10 % (17 627,00 бел. руб.).**

**Задатки в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.03.2018. Аукцион состоится **30.04.2018 в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.04.2018 до 16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

# КРЫЛАТЫ СЯБРА

## У Бярозаўскім раёне абралі свой птушыны сімвал

**У фінале конкурсу за званне птушкі-сімвала змагаліся рэмез звычайны, чарацянка вяртлявая і зімародак. Галасаванне прайшло ў школьных і працоўных калектывах, а таксама на сайце раённай газеты «Маяк». У ім паўдзельнічалі больш за шэсць тысяч чалавек.**




У выніку за рэмеза прагаласавалі 892 удзельнікі, на другім месцы — зімародак (1913), а на першым — чарацянка (3296). Пераможца — самая рэдкая пеўчая птушка Еўропы, абараняецца як від, які знікае, і пражывае ў заказніку «Спораўскі» Бярозаўскага і Драгічынскага раёнаў. На яе галаве жоўта-белаватыя палоскі, якія са спіны заходзяць на надхвосце, грудзі — светлыя, у цёмныя рыскі. Птушка невялікая: даўжыня цела — 13 см, размах крылаў — 16—19 см. У якасці прыроднага сімвала была зацверджана на 27-й сесіі Бярозаўскага раённага Савета дэпутатаў.

Зараз чытачам газеты «Маяк» прапануецца распрацаваць лагатып птушкі-сімвала і зрабіць эскіз скульптуры чарацянкі, якая, хутчэй за ўсё, з'явіцца ў Бярозе. Свае прапановы можна дасылаць на паштовы ці электронны адрас газеты.

# НЯРЫБНЫ ДЗЕНЬ

## Сезонная забарона на лоўлю ўступіла ў сілу

**У Віцебскай вобласці з 10 красавіка па 8 чэрвеня ўключна ўводзіцца веснавая забарона на лоўлю рыбы. Гэта робіцца для стварэння спрыяльных умоў для нерасту, пра што піша «Браслаўская звязда». У адзначаны тэрмін забараняецца прамысловая лоўля на ўсіх вадаёмах, акрамя лоўлі вугра, які мігрыруе, у месцах, вызначаных Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі.**

Аматарская лоўля дазволена толькі ў светлы час сутак з берага, са штучных збудаванняў і канструкцый, акрамя чыгуначных мастоў, плацін, шлюзаў, іншых гідратэхнічных аб'ектаў, на якіх устаноўлены абмежаванні і забароны на гаспадарчую дзейнасць, і на 50 м па абодва бакі ад такіх месцаў. Для лоўлі можна выкарыстоўваць адну вудачку з адным кручком або спінінг са штучнай прынадай, аснашчанай адзінарным, двайным ці трайным кручком.

Начальнік міжраённай інспекцыі АЖіРС Віталь Буда нагадвае спінінгістам, што з 15 красавіка па 30 мая ўстанаўліваецца забарона на лоўлю судака. Рыбу гэтага віду, якая трапіць на кручок, трэба абавязкова выпускаць у вадаём. У час веснавога нерасту таксама забараняецца аматарская лоўля на штучных нерасцілішчах возера Дрывяты.

# КРУГОМ ВАДА

## У Навасёлах падтапіла чатыры дамы

**Пра красавіцкія прыродныя жарты піша газета «Голас Веткаўшчыны». Старажылы населенага пункта гавораць, што так блізка вада яшчэ ніколі не падступала. Гаспадары дамоў, якім не пашчасціла, пераязджалі да суседзяў вышэй. У хаце Ірыны Салтыковай эвакуіраваць прыйшлося і мэблю: вада з падмурка паднялася на першы паверх.**

Жанчына пераехала ў Навасёлкі 12 гадоў таму, пакінуўшы абласны цэнтр. Тут пачала працаваць даяркай, далі жыллё. Гаспадары зрабілі касметычны рамонт: абнавілі мэблю, паслалі лінолеум... Цяпер многае неабходна перарабляць.

Звычайна ўвесну уся вада сыходзіць у палі праз водапрапускную трубу. Але сёлета яна гэты шлях не абрала. Чаму — пакуль невядома. У ДРБУ-185, якое адказвае за гэты аб'ект, гавораць, што восенню ніякіх перашкод не было. Мясцовыя ж жыхары расказваюць, што адзін з суседзяў закладваў трубу смеццем, бо раней вада ішла праз яго агарод. Старшыня Шарсцінскага сельскага Савета Святлана Цімохава растлумачыла, што, калі ішло добраўпарадкаванне, жыхары рабілі пад'езды да сваіх дамоў і ў адным месцы пашкодзілі меліярацыйны канал. Першы сігнал быў яшчэ пасля ліўня 29 ліпеня. Тады на гэта не звярнулі патрэбнай увагі.

Цяпер на праблему адрэагавалі аператыўна: збудавалі дамбу з мяшкоў з пяском, пракапалі водаадводны канал, дзе потым пракладуць трубу. Ваду спусцілі, засталася вільгаць. Яўген Чарняўка, дырэктар ААТ «Хальч», на балансе якога знаходзяцца падтопленыя будынкі, адзначыў: калі падсохне, можна будзе ацаніць сітуацыю і, калі ёсць сур'ёзныя пашкоджанні, дапамагчы ў рамонце. Але, як заўважыў намеснік старшыні Веткаўскага райвыканкама Уладзімір Зіневіч, у гэтай сітуацыі людзям значна спрасціла б жыццё страхоўка.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

ДЫНАСТЫІ

# КУЛЬТУРАЙ «ЗАХВАРЭЛА» З ДЗЯЦІНСТВА

## Чаму Наталля Шымановіч памяняла прафесію

**Як правіла, мы часта чуем пра дынастыі механізатараў, медыкаў, настаўнікаў. Дзякуючы намаганням адных на нашым стале ёсць хлеб і да хлеба, іншыя пазбаўляюць нас ад фізічных хвароб, трэція вучаць разумнаму, добраму, вечнаму. А вось тых, хто далучае нас да культурных каштоўнасцяў, робіць наша жыццё духоўна багатым і цікавым, згадваем не так часта.**


Наталля ШЫМАНОВІЧ.

У сакавіку загадчыца Селішчанскага сельскага клуба Вілейскага раёна Наталля Шымановіч адзначыла сваё 55-годдзе. Культурай яна «захварэла» яшчэ ў дзяцінстве. Бацька Канстанцін Пятровіч працаваў дырэктарам Ільянскага сельскага Дома культуры. У 1976-м пераехаў у Слуцкі раён, узначаліў Падлескі СДК, дзе, як і на папярэднім месцы, арганізаваў духавы аркестр. Канстанцін Паўлавіч кіраваў калектывам, сам іграў на трубе. Ствараў ён і модныя на той час вакальна-інструментальныя ансамблі, у якіх прымаў актыўны ўдзел.

Маці — Вера Мікалаеўна — была надзвычай творчым чалавекам, валодала не толькі арганізатарскімі, але і мастацкімі, вакальнымі здольнасцямі, пісала вершы. Працавала поруч з мужам у ільянскім доме культуры.

Наталля Канстанцінаўна атрымала ў тэхнікуме сельскагаспадарчую спецыяльнасць і спачатку працавала брыгадзірам на жывёлагадоўчай ферме. Але затым захацела прайсці пераскочыць курсы культработнікаў. Відаць, бацькоўскія гены ўзялі сваё. «Творчая дзейнасць мамы і таты праходзіла на маіх вачах, увесь вольны час я праводзіла ў клубе», — згадвае Наталля Канстанцінаўна.


Дочкі Вераніка і Ірына.

Яе дочкі-блізняты — Ірына і Вераніка — пайшлі па слядах маці. Дзяўчаты закончылі Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў па спецыяльнасці «Народная творчасць (харавая музыка)». Творчую дзейнасць пачыналі ў Ілі, затым пераехалі ў Селішча: Ірына кіравала вакальным гуртам «Зорачка», а яе сястра была культарганізатарам. Цяпер дочкі змянілі месца працы, але не здрадзілі абранай прафесіі. Ірына Суднікoвіч — метадыст у Маладзечанскім палацы культуры, а Вераніка Пташнік — мастацкі кіраўнік у нарачанскім Доме культуры.

— Дочкі самі зрабілі выбар, — кажа Наталля Канстанцінаўна. — Яны, можна сказаць, выгадаваліся на сцэне. Вячэрняя рэпетыцыя, падрыхтоўка мерапрыемства — яны са мной і пелі з маленства, і танцавалі. А цяпер ужо і ўнукі прыходзяць у клуб: дачушка майго сына Косці частая наведвальніца. Унука таксама да сваіх спраў прыцягваю, ён не супраць, — не нарадуецца бабуля.

— Наталля Канстанцінаўна — ініцыятыўны работнік, літаральна фантануе ідэямі, — кажа **інжынер структурнага падраздзялення «Аўтаклуб» цэнтралізаванай клубнай сістэмы Вілейскага раёна Людміла ЛЯШКЕВІЧ.** — Яна не толькі творчы чалавек, але і добры гаспадарнік, арганізавала і вядзе гурток сольных спеваў для дарослых «Надзея» і дзіцячы гурток «Салавейка».

— Вядома, хочацца, каб у нас быў спецыяліст з вакальнымі данымі, які займаўся б з дзецьмі, бо самой цяжка за ўсім паспяваць: і гурток весці, і справаздачы рыхтаваць, і ўстановай кіраваць, і гаспадарчыя пытанні вырашаць. Часам даводзіцца і прыбіраць у памяшканні, і снег на вуліцы расчышчаць. У мяне на паўстаўкі працуе жанчына. Грошы невялікія атрымлівае, а клопатаў у яе хапае. Вось так і выручаем адна адну, — канстатуе Наталля Шымановіч.

На думку загадчыцы, культура трымаецца на энтузіязме апантаных людзей: «На такіх вось «ненармальных», якія цягнуць усё не ў дом, а з дому. Бо ўсё што можна: і ручнічкі, і гаршкі з кветкамі, і сурвэткі — усё, што можа спатрэбіцца для творчасці, нясу на працу».

Дарэчы, стыльную канапу, на якой мы сядзім, Наталлі Канстанцінаўне падарылі, а яна прывезла яе ў клуб. Вырашыла, што дома без яе абыдзецца. Няхай лепш наведвальнікі адпачнуць з камфортам.

— Наталля Канстанцінаўна — майстар на ўсе рукі. Сама перашывае касцюмы са старых рэчаў для самадзейных артыстаў, — дадае Людміла Ляшкевіч. У мінулым годзе праводзілі парад Дзядоў Марозаў, дык яна ўсіх казачных персанажаў асабіста экіпіравала. З нічога зробіць цукерку.

— Умею і шыць, і вышываць, і вязаць, але на ўсё часу не хапае. Нялёгка сумяшчаць усе абавязкі, — уздыхае мая суразмоўніца.

Селішча — маладая вёска, тут пражываюць 280 чалавек, у асноўным моладзь. Хтосьці працуе ў аграгарадку, а нехта ў Маладзечане, Чысці. Пасля работы ўсе вяртаюцца дадому. А чалавеку патрэбны не толькі хлеб надзённы, але і добрая песня, і цікавы адпачынак, які арганізоўвае для землякоў Наталля Шымановіч.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 12 красавіка 2018 года.**